Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

30 ВЕРАСНЯ 2017 г. СУБОТА №189 (28553)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ВЫСАКАРОДНАЯ, АДКАЗНАЯ ПРАЦА

Педагагічным работнікам Рэспублікі Беларусь

Дарагія сябры!

Ад усёй душы віншую вас з прафесійным святам — Днём настаўніка.

У жыцці кожнага з нас ёсць настаўнікі, чые мудрасць, душэўная шчодрасць і добрая парада дапамагаюць пазнаваць гэты дзіўны свет, знаходзіць маральныя і духоўныя арыенціры, пераадольваць цяжкасці і дасягаць перамог.

Высакародная, адказная праца настаўніка, якая патрабуе поўнай самаадданасці, заўсёды карысталася асаблівай павагай. Адкрываючы перад дзіцем дзверы ў свет ведаў, выхоўваючы яго, вы фарміруеце асобу юнага грамадзяніна і закладваеце асновы будучыні Беларусі.

Сучаснае адукацыйнае асяроддзе, як жывы арганізм, пастаянна развіваецца — укараняюцца новыя тэхналогіі і метады навучання. Незменнымі застаюцца толькі роля і аўтарытэт педагога. Вы з гонарам выконваеце сваю важную місію, заўсёды знаходзіцеся ў цэнтры грамадскага жыцця, умацоўваеце ідэалагічны фундамент нашай краіны.

Перакананы, вашы энтузіязм, бязмежная цярплівасць і адданасць прафесіі знойдуць водгук у сэрцах выхаванцаў і паслужаць дастойным прыкладам для падрастаючага пакалення.

Жадаю вам шчасця, моцнага здароўя, дабрабыту, таленавітых і зацікаўленых вучняў!

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

ЦЫТАТА ДНЯ

Аляксандр РУМАК, намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны:

«Правядзенне перараразліку працоўных пенсій у сувязі з ростам сярэдняй заработнай платы работнікаў у краіне плануецца да канца 2017 года ў межах сродкаў дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва. Зараз праводзяцца неабходныя разлікі для павышэння працоўных пенсій. Пенсіі атрымліваюць больш як 2,5 млн чалавек. Адной з асноўных сацыяльных задач дзяржавы з'яўляецца падтрыманне ўзроўню пенсій непрацаздольных грамадзян і забеспячэнне своечасовасці і паўнаты іх выплат. Гэтая задача выконваецца».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 30.09.2017 г.

Долар ЗША	1,9623 ▼
Еўра	2,3141 ▼
Рас. руб.	0,0338 ▲
Укр. грыўня	0,0737 ▼

ISSN 1990 - 763X

МАБІЛІЗАВАЦЦА І ЎБРАЦЬ ПАЛІ

Кіраўнік дзяржавы наведаў з рабочай паездкай Мінскую вобласць

Адзін дзень увосень ідзе за восем. Сёння запаволішся, а заўтра можа і дождж пайсці, і замаразкі адбыцца. Для таго каб сабраць добры ўраджай, варта напружыцца, сканцэнтраваць намаганні і ў максімальна кароткія тэрміны скончыць восеньскія палявыя работы. Да гэтага заклікаў аграрыяў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падчас візіту ў Клецкі раён, што на Міншчыне.

Фота БЕЛТА.

У бульбасховішчы ААТ «Кухчыцы».

Па словах кіраўніка дзяржавы, пасля таго як была скончана ўборка збожжавых, магчыма, працаўнікі сяла ў пэўнай ступені самасупакоіліся. Аднак шмат чаго яшчэ не сабрана, і напярадзе — нямала працы як па зборы ўраджаю, так і па сяўбе азімых. Зараз асабліва важна сканцэнтраваць увагу на кукурузе, якая вырашчана на сілас. «Трэба мабілізавацца. Шкада будзе, калі прападзе такі добры ўраджай», — заўважыў Прэзідэнт.

СТАР. 2

■ Са святам!

Пакліканне — вучыць

Чацвёрты год Вольга ПРЫГУН працуе настаўніцай беларускай мовы і літаратуры ў Бараўлянскай гімназіі. І кожны год у маладога педагога — творчыя поспехі. Вольга Андрэеўна паспела перамагчы ў конкурсе педагагічнага майстэрства Мінскага раёна, падрыхтаваць пераможцу рэспубліканскай алімпіяды па беларускай мове і літаратуры. І паралельна — вучыцца ў аспірантуры Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта. Тут жа яна стала магістрам філалагічных навук.

Марына БЕГУНКОВА, фота аўтара.

Мінскі раён.



Вольга ПРЫГУН з вучнямі 5 «В» класа Бараўлянскай гімназіі.

Святлана РУМЯНЦАВА.

■ Класныя навіны

НАСТАЎНІК — ПА-ЗА ЧАСАМ, МОДАЙ І ГЕАГРАФІЯЙ

Дыпламаты, палітыкі, разведчыкі і акцёры — у адной асобе

«Чалавек, які на прагулцы сочыць не толькі за сваім дзіцем, а за ўсім дваром — гэта настаўнік. Чалавек, які ідзе з поўным пакетам, але не прадуктаў, а сшыткаў, — таксама настаўнік. Нават сыходзячы з работы, ён не перастае працаваць, займаецца з дзецьмі не толькі ў школе, але і дома, таму што не можа адмовіць сваім сваякам і суседзям», — вось такі жартаўліва-рэалістычны партрэт педагога намаляваў суперфіналіст рэспубліканскага конкурсу «Настаўнік года — 2017» Максім ДУБІНА. Ён, між іншым, стаў самым маладым удзельнікам суперфіналу. Настаўнікам фізікі працуе са жніўня 2013 года: пачынаў у Скірмантаўскай сярэдняй школе, а цяпер выкладае фізіку ў сярэдняй школе №1 Фаніпаля. Яго педагагічнае крэда — словы Імануіла Канта: «Не думкам трэба вучыць, а думаць».

ЯК ЗДЗІВІЎ ВАЎКАВЫСК

Рэспубліканскі конкурс прафесійнага майстэрства «Настаўнік года» праводзіцца ў нашай краіне раз у тры гады. **Старшыня журы суперфіналу, рэктар Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта, доктар педагагічных навук, прафесар Аляксандр ЖУК** лічыць, што рабіць гэта часцей не трэба — паўза павінна быць, найперш, для таго, каб асэнсаваць прадстаўлены досвед. Для сістэмы адукацыі гэты конкурс — крыніца новых думак, новых ідэй і аўтарскіх методык. Да таго ж усе этапы спаборніцтва арганізоўваюцца на працягу навучальнага года (школьны, раённы, абласны і рэспубліканскі), што патрабуе шмат часу, таму перапынак проста неабходны.

СТАР. 4

МАБІЛІЗАВАЦЦА І ЎБРАЦЬ ПАЛІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Наступны год мы аддадзім цалкам парадку, культуры земляробства, культуры на палях, — заявіў беларускі лідар. — Больш не разлічвайце на вялікія грошы і капітальную падтрымку. Год добры. Зарабляйце грошы. Мы павінны сканцэнтраваць сродкі на меліярацыйных, культурна-тэхнічных работах. Трэба прыводзіць у парадак краіну. І нарэшце трэба ставіць пытанне аб рэкультывацыі былых фермаў».

Адно з пытанняў, якія падчас паездкі разгледзеў Аляксандр Лукашэнка, датычылася ўборкі цукровых буракоў. На цяперашні момант насенне для гэтай культуры вырошчваецца ў Італіі і Сербіі. Гэта гібрыды, створаныя з удзелам беларускіх навукоўцаў. Таксама нядаўна паступіла прапанова па вырошчванні такога насення і ад Азербайджана. Прэзідэнт прапанаваў праявіць больш самастойнасці ў згаданым пытанні: на падыходзячай для вырошчвання глебе ў спрыяльным клімаце, напрыклад, у блізкай для нас Сербіі, гадаваць ужо ўласныя сарты і такім чынам забяспечваць краіну неабходным насеннем.

Адкрытае акцыянернае таварыства «Кухчыцы», якое наведаў Прэзідэнт, — адзін з паспяховых прыкладаў развіцця сельскай гаспадаркі. Па словах **яго кіраўніка Сяргея ЗДРОКА,** летась выручка склала больш за 100 млрд недэнамінаваных беларускіх рублёў, а сёлета чакаецца яе рост амаль на 50%. Такое стала магчыма дзякуючы эксперыментам, якія дазваляюць выбіраць самыя ўдалыя для гэтай мясцовасці сарты раслін. Сёлета ў Кухчыцах упершыню пасадзілі кармавую культуру сорга, якую таксама называюць суданскай травой.

Разам з тым міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Леанід Заяц далажыў, што праведзеныя разлікі пацвярджаюць магчымасць сфарміраваць нізкі сабекошт пры вытворчасці малака з выкарыстаннем традыцыйных для Беларусі кармавых культур. Асабліва гэта актуальна для Віцебшчыны, дзе ў многіх раёнах немэтазгодна вырошчваць вялікія аб'ёмы збожжавых і асноўная спецыялізацыя сельскіх гаспадарак павінна быць звязана з мясной жывёлагадоўляй.

Кіраўнік дзяржавы азнаёміўся таксама з умовамі захоўвання бульбы ў «Кухчыцах», і з тэхналогіяй збору кукурузных зерняў у так званы палімерны рукаў.

«Сорга менш патрабавальнае да глебы, высейваецца пазней. З аднаго поля можна сабраць два ўраджаі», — тлумачыць Сяргей Здрок. Расліна не баіцца неспрыяльных кліматычных умоў і не патрабуе вялікай колькасці ўгнаенняў. Выглядае поле сорга як зялёны лес у больш чым два метры вышынёй. На думку кіраўніка дзяржавы, кожная гаспадарка вольная вырошчваць тую кармавую культуру, якая найбольш падыходзіць да мясцовых умоў.

Вераніка ПУСТАВІТ.
pustavit@zviazda.by
а. г. Кухчыцы, Мінская вобласць.

НЯЗМЕННЫ ЗНЕШНЕПАЛІТЫЧНЫ ПРЫЯРЫТЭТ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваў віншавальнае пасланне Старшыні Кітайскай Народнай Рэспублікі Сі Цзіньпіну з нагоды святкавання Дня абвяшчэння КНР, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што за 25 гадоў з моманту ўстанаўлення дыпламатычных адносін Беларусь і Кітай дасягнулі якаснага прарыву на двухбаковым узроўні і працягваюць актыўна нарошчваць узаемадзеянне па ўсіх кірунках, каардынаваць намаганні пры вырашэнні важных задач рэгіянальнага і глабальнага парадку дня, у тым ліку пры рэалізацыі стратэгічнай канцэпцыі «Адзін пояс і адзін шлях».

«Раўнапраўнае і ўзаемавыгаднае супрацоўніцтва з КНР з'яўляецца нязменным знешнепалітычным прыярытэтам беларускай дзяржавы», — падкрэсліў Прэзідэнт. Аляксандр Лукашэнка запрасіў Старшыню Кітайскай Народнай Рэспублікі наведаць Беларусь з дзяржаўным візітам у 2018 годзе, выказаўшы ўпэўненасць, што гэтая падзея надасць новы магутны імпульс двухбаковаму ўзаемадзеянню.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

У Францыі прадухілілі 12 тэрактаў

Улады Францыі з пачатку года прадухілілі 12 тэрактаў, мэтай якіх былі асобныя людзі, месцы масавага збору людзей і грамадскія ўстановы, заявіў міністр унутраных спраў краіны Жэрар Калон у эфіры тэлеканала CNEWS. Міністр распавёў, што, па звестках МУС, у Францыю з Блізкага Усходу вярнуліся 343 радыкальна настроеныя «баевікі», праваахоўныя органы сочаць за 18 тысячамі меркаваных радыкалаў. Па словах міністра, «твар тэрарызму» вельмі змяніўся з тэракта ў «Батаклане», сёння праваахоўныя органы і спецслужбы ведаюць, як змагацца з радыкальна настроенымі элементамі. Аднак найбольшую складанасць уяўляюць тыя, хто «радыкалізуецца ў сваіх кварталах і вырашае здзейсніць атаку з нажом або на машыне».

У ЗША анансавалі гіпергукавую рэвалюцыю

Віцэ-прэзідэнт па аэранаўтыцы Lockheed Martin Арланда Карвальа, выступаючы на Міжнародным аэратэхнічным кангрэсе, ацаніў прагрэс Злучаных Штатаў у стварэнні гіпергукавога беспілотніка SR-72, паведамляе Aviation Week. «Я мяркую, што ЗША знаходзяцца на парозе гіпергукавай рэвалюцыі», — сказаў Карвальа. Гэтую заяву выданне звязала з выпрабаваннямі прататыпа SR-72. Згодна з планамі Lockheed Martin, перспектыўны гіпергукавы беспілотнік будзе здольны лятаць на хуткасцях да 6,9 тысячы кіламетраў у гадзіну. Лічыцца, што ён можа выкарыстоўвацца для разведкі, высокая хуткасць апарата не дазволіць саперніку перахапіць яго. Поўнамаштабную рабочую версію SR-72 плануецца стварыць да канца 2020-га.

Знойдзены эскіз аголенай Моны Лізы



У Францыі знойдзены малюнак з выявай аголенай жанчыны, які, мяркуюць эксперты, мог быць эскізам для карціны «Мона Ліза» Леанарда да Вінчы. Пра гэта паведамляе BBC News. Зроблены вугалем партрэт вядомы як «Мона Вана». Ён з 1862 года захоўваецца ў Музеі Кондэ ў Шанціі каля Парыжа і ўвесь гэты час лічыўся работай іншага мастака. Аднак пасля серыі экспертыз, праведзеных супрацоўнікамі Луўра, з'явіліся падставы меркаваць, што да малюнка прыклаў руку сам да Вінчы.

■ З нагоды

ЗАКОНЫ Ў АДКРЫТЫМ ДОСТУПЕ

Агульная колькасць дакументаў у розных базах даных Нацыянальнага цэнтра прававой інфармацыі перавышае 270 тысяч

Заўтра Нацыянальнаму цэнтру прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь (НЦПІ) спаўняецца 20 гадоў. НЦПІ з'яўляецца цэнтральнай дзяржаўнай навукова-практычнай установай, якая ажыццяўляе збор, улік, апрацоўку, захоўванне, сістэматызацыю і актуалізацыю эталоннай прававой інфармацыі, яе распаўсюджванне (прадстаўленне), а таксама афіцыйнае апублікаванне прававых актаў.

Яго філіялы створаны ў абласных цэнтрах краіны і ў Мінску. Супрацоўнікі Цэнтра маюць вышэйшую адукацыю — як правіла, юрыдычную, у сферы інфармацыйных тэхналогій, філалагічную.

Наш карэспандэнт сустрэўся з намеснікам дырэктара Нацыянальнага цэнтра прававой інфармацыі Мікалаем РАДЗІВАНОВІЧАМ і папрасіў яго больш падрабязна расказаць аб рабоце Цэнтра.

— Мікалай Мікалаевіч, для Вас і супрацоўнікаў Цэнтра юбілей, хутчэй за ўсё, не толькі радасная падзея, але і нагода падвесці некаторыя вынікі. Які, на Ваш погляд, галоўны вынік дзейнасці Цэнтра?

— Самае важнае — у Беларусі створана і пастаянна развіваецца дзяржаўная сістэма прававой інфармацыі, заснаваная на выкарыстанні перадавых інфармацыйных тэхналогій. Аснова гэтай сістэмы — такія інфармацыйна-прававыя рэсурсы, як Нацыянальны рэестр прававых актаў, сістэма ўліку прававых актаў, уключэнню ў якую падлягаюць усе акты заканадаўства Рэспублікі Беларусь, — штогод больш за 10 тыс. прававых актаў), эталонны банк даных прававой інфармацыі (каля 210 тыс. дакументаў) і Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал. Іх фарміраванне і вядзенне немагчыма без створанай НЦПІ тэхналогіі, ядром якой з'яўляецца праграмнае забеспячэнне.

Вышэйзгаданыя рэсурсы створаны НЦПІ дзякуючы таму, што ў нашай арганізацыі рэальна спалучаюцца навуковая і практычная дзейнасць у галіне прававой інфарматызацыі.

— Па якіх асноўных кірунках арганізавана дзейнасць Цэнтра?

— Дзейнасць НЦПІ вельмі шматпланавая, але стратэгічнымі для Цэнтра з'яўляюцца два кірункі — акумуліраванне прававых актаў і распаўсюджванне прававой інфармацыі.

Мы забяспечваем збор, захоўванне, сістэматызацыю, афіцыйнае апублікаванне прававых актаў, даём магчымасць не толькі дзяржаўным арганізацыям, але і ўсім грамадзянам атрымліваць якасную прававую інфармацыю.

Агульная колькасць дакументаў у розных базах даных перавышае 270 тысяч. У якасці сродку доступу да прававой інфармацыі выкарыстоўваюцца створаныя НЦПІ інфармацыйна-пошукавыя сістэмы «ЭТАЛОН» і «ЭТАЛОН-ONLINE» (etalonline.by).

— Адной з задач НЦПІ з'яўляецца афіцыйнае апублікаванне прававых актаў. Як Цэнтр спраўляецца з ёй?

— Трэба адзначыць, што з 1 ліпеня 2012 года афіцыйнае апублікаванне прававых актаў у краіне ажыццяўляецца толькі ў электронным выглядзе. Адзінай крыніцай афіцыйнага апублікавання з'яўляецца Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал www.pravo.by — асноўны дзяржаўны інфармацыйны рэсурс глабальнай камп'ютарнай сеткі Інтэрнэт у сферы права і прававой інфарматызацыі.

Сам працэс афіцыйнага апублікавання максімальна аўтаматызаваны, і ўсе апрацаваныя на працягу дня дакументы апоўначы з'яўляюцца на партале. Гэта вельмі важная і адказная задача, якую паспяхова выконвае Цэнтр, бо, як правіла, толькі з моманту размяшчэння на Партале дакументы, якія закранаюць правы і законныя інтарэсы грамадзян, уступаюць у сілу.

— Як Вам, не юрысту, а спецыялісту ў сферы ІТ, працуецца ў Цэнтры?

— Па першае, у нашай арганізацыі бытуе меркаванне, што ўсе, хто працуе ў нас, у той або іншай меры становяцца юрыстамі. І ў гэтым ёсць доля праўды. А па-другое, уся дзейнасць Цэнтра звязана з інфармацыйнымі тэхналогіямі, і ў нас працуюць кваліфікаваныя ІТ-спецыялісты.

Для апрацоўкі значных аб'ёмаў юрыдычнай інфармацыі патрабуецца спецыялізаванае праграмнае забеспячэнне, якое трэба распрацоўваць і пастаянна развіваць. Яго нельга купіць гатовым. Натуральна, што некаторая частка распрацовак выконваецца староннімі арганізацыямі, але асноўная частка ўсё ж ствараецца нашымі спецыялістамі. Гэта дазваляе аператыўна ўносіць змяненні ў праграмныя прадукты і развіваць іх з улікам змянення падыходаў як па апрацоўцы прававой інфармацыі, так і па яе распаўсюджванні.

— Прывядзіце прыклады найбольш важных для дзейнасці Цэнтра праграмных прадуктаў.

У рамках выканання работ па ўкараненні электроннага дакументаабароту ў нарматворчасць НЦПІ ўведзена ў эксплуатацыю аўтаматызаваная інфармацыйная сістэма, якая забяспечвае фарміраванне Нацыянальнага рэестра прававых актаў (АІС НРПА). Да яе падключаны выканаўчыя камітэты і Саветы дэпутатаў ва ўсіх раённых цэнтрах краіны. Гэта дазваляе павысіць аператыўнасць прыняцця і ўступлення ў сілу актаў заканадаўства, скараціць бюджэтныя расходы.

Шырока вядомыя ў краіне праграмныя прадукты, якія забяспечваюць работу з эталонным і іншымі банкамі даных прававой інфармацыі — інфармацыйна-пошукавыя сістэмы «ЭТАЛОН» і «ЭТАЛОН-ONLINE». Гэта самая актуальная і поўная крыніца афіцыйнай прававой інфармацыі. Прычым мы пастаянна праводзім работы па іх развіцці.

Нароўні з Нацыянальным прававым інтэрнэт-парталам Цэнтр забяспечвае вядзенне Прававога форуму Беларусі, Дзіцячага прававога сайта і іншых інтэрнэт-рэсурсаў.

— Мікалай Мікалаевіч, дзякуй за інтэрв'ю. Карыстаючыся выпадкам, мы таксама далучаемся да віншаванняў і жадаем калектыву Цэнтра поспехаў у яго высакароднай справе.

— У заключэнне хочацца адзначыць, што дасягнутыя поспехі немагчымыя без пастаяннай падтрымкі з боку кіраўніцтва краіны, цеснага і плённага супрацоўніцтва з усімі дзяржаўнымі органамі і, безумоўна, карпатлівай і творчай працы ўсяго калектыву Цэнтра.

Вялікі дзякуй за віншаванні. Шкада толькі, што фармат кароткага інтэрв'ю не дазваляе дэталёва паведаміць аб усіх аспектах дзейнасці Нацыянальнага цэнтра прававой інфармацыі. Аднак спадзяюся, што нават агучаныя тэмы дапамогуць рэальна ўявіць маштабнасць і разнастайнасць вырашаемых Цэнтрам задач.

Карысныя спасылкі ад НЦПІ:

Pravo.by — Нацыянальны прававы інтэрнэт-партал;
www.forumpravo.by — Прававы форум Беларусі;
www.mir.pravo.by — Дзіцячы прававы сайт;
www.etalonline.by — інфармацыйна-пошукавая сістэма «ЭТАЛОН-ONLINE»;
ncpi.gov.by — сайт НЦПІ;
акаўнты НЦПІ ў сацыяльных сетках — twitter.com/NCPIGOVBY, twitter.com/MirPravoBy, vk.com/pravoby, ok.ru/pravoby, facebook.com/pravoby, chats.viber.com/pravo.by, youtube.com/user/NCPIBELARUS.

■ Я зноў выбіраю «Звязду»

«ГЭТА СВАЁ, БЛІЗКАЕ І РОДНАЕ»

Сяргей СТРЭЧАНЬ, галоўны дзяржаўны ветэрынарны інспектар Нясвіжскага раёна:

— Са «Звяздой» я пазнаёміўся ў 1970-х гадах, калі яе выпісвалі мае бацькі. А пасля і сам працягнуў гэтую традыцыю. Адбылося гэта ўжо ў сталым узросце, у пачатку 1990-х гадоў, калі шмат увагі пачалі ўдзяляць роднай мове і на тых, хто размаўляў на ёй, глядзелі з вялікай павагай. Прыгадваю гісторыю, якая адбылася са мной у той час. Прыйшоў неяк у натарыяльную кантору, афармлення дакумента там трэба было чакаць некалькі дзён. Выпадкова разгаварыўся з жанчынай, якая займалася ім. І ёй так спадабалася, што я размаўляю па-беларуску, што тую паперку яна зрабіла мне літаральна за гадзіну! Відаць, яна некалі ведала мову, але пасля доўгі час не размаўляла на ёй. Толькі пыталася: «Адкуль вы ведаеце беларускую мову?»

Мне прыемна пагутарыць на ёй з вясковымі жыхарамі, няхай сабе нават на трасянцы. Цябе адразу за свайго ўспрымаюць. У дзяржаўных установах раней, пачуўшы мову, здзіўлена паварочваліся ў твой бок, а апошнім часам глядзяць ужо з павагай. Таму што без мовы няма нацыі, няма ідэнтыфікацыі народа! Калі чую каментатара на тэлебачанні, міністра ці пасла, які добра размаўляе на роднай мове, — прыемна паслухаць. Во, гэта наша дзяржава! Я ганаруся тым, што ў родзе — усе беларусы. У нас багатая гісторыя, якую трэба ведаць. Таму, калі чытаю «Звязду» на роднай мове, даведваюся пра нейкія факты з мінулага або пра жыццё цяперашніх простых людзей, адразу прыгадваю родную вёску, школу — колішні радзівілаўскі маёнтак, словы бацькі: «Тут некалі дзедаў лес быў»... «Звязда» — гэта сваё, блізкае і роднае.

У газеце найперш падабаюцца матэрыялы Святланы Яскевіч, Алены Ляўковіч, вядома ж, «Народ на провадзе» Валянціны Доўнар. Эканамічныя агляды чытаю, цікаўлюся прагнозамі цэн на жыллё, бо сын малады, жыллёвае пытанне ў яго пакуль не вырашана. Калі што спадабалася, ціхенька сваім хатнім падсоўваю пачытаць. На рабоце на станцыю раней па ведамаснай падпісцы прыходзіў адзін экзэмпляр «Звязды», але вось ужо колькі гадоў іх выпісваем два. Супрацоўнікі выданні разбіраюць, але сакратарка добра ведае, што на маім стале павінны абавязкова ляжаць тры газеты: «Звязда», «Сельская газета» і раёнка. І часцей за ўсё менавіта «Звязду» я бяру ў рукі першай...

Запісаў Сяргей РАСОЛЬКА.
rs@zviazda.by

■ Ліга Еўропы

НЕ РОБІМ ТРАГЕДЫІ

У дамашнім матчы барысаўскі БАТЭ прайграў лонданскаму «Арсеналу»

Адны з лідараў англійскага футбола выставілі на матч супраць чэмпіёна Беларусі далёка не аптымальны свой склад. Так за межамі поля Арсен Венгер пакінуў дасведчанага чэшскага галкіпера Пятра Чэха, чылійца Алексіса Санчэса, немца Месута Азіла і іншых гульцоў асноўнага складу. Аднак і рэзервісты здолелі паказаць свой клас. Лік быў адкрыты ўжо на 9-й хвіліне, мяч у вароты Дзяніса Шчарбіцкага закінуў Тэа Уолкат, а на 22-й хвіліне ён паўтарыў свой галявы поспех. На гэтым гульцы «Арсенала» не супакоіліся і яшчэ раз умацавалі сваю перавагу, Роб Холдзінг зрабіў лік 0:3 на 26-й хвіліне сустрэчы.

На шчасце, хутка Мірка Іваніч эфектным ударам адыграў адзін гол, а адразу пасля пачатку другой паловы сустрэчы Аліўе Жыру рэалізаваў пенальці. Міхаіл Гардзяйчук усталяваў канчатковыя лічбы на табло — 2:4 на карысць гасцей.

— *Спадзяваліся на іншую гульню і на іншы вынік. На жаль, пачатак сустрэчы атрымаўся жахлівы. Але я ўдзячны хлопцам за тое, што нам удалося захаваць твар. І, па меншай меры, у другім тайме мы бачылі каманду на полі,* — адзначыў пасля матча **галоўны трэнер БАТЭ Аляксандр ЕРМАКОВІЧ.** — *Так, дзесьці рызыкавалі, агалялі тылы. Але забілі два мячы і маглі яшчэ. Спадзяюся, даставілі задавальненне балельшчыкам хоць бы ў другім тайме. Вядома, хваляванне прысутнічала. Такія памылкі, што рабілі гульцы, нічым іншым растлумачыць нельга. Мы разумеем сілу «Арсенала», таму, вядома, не робім ніякай трагедыі з таго, што здарылася.*

Фота Надзеі БУЖАН.

У іншым паядынку другога тура групы Н нямецкі «Кёльн» прымаў на сваім полі бялградскую «Црвену Звезду» і саступіў з мінімальным лікам 0:1.

Турнірнае становішча пасля двух тураў: «Арсенал» — 6 ачкоў (розніца мячоў — 7—3), «Црвена Звезда» — 4 (2—1), БАТЭ — 1 (3—5), «Кёльн» — 0 (1—4).

У наступным туры 19 кастрычніка футбалісты БАТЭ прымуць на сваім полі «Кёльн», у Бялградзе згуляюць «Црвена Звезда» і «Арсенал».

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.
lobazhevich@zviazda.by

У «Языльскай дзясятцы» — юбілей

У Старых Дарогах на Міншчыне 30 верасня пройдзе Нацыянальны фестываль бегу «Языльская дзясятка» — трыццаты па ліку. На ім будуць узнагароджаны шэсць спартсменаў, якія ўнеслі значны ўклад у развіццё фестывалю і шмат зрабілі для прапаганды і распаўсюджвання бегу ў Беларусі. Гэта Андрэй Гардзееў, Зарыслаў Гапеенка, Ілья Славенскі, Вольга Краўцова, Наталля Галушка і Алена Мазоўка.

У спаборніцтвах змогуць прыняць удзел усе ахвотныя незалежна ад узросту. Адзіная ўмова — медыцынскі допуск да спаборніцтваў.

— Упершыню «дзясятка» стартавала 6 лістапада 1988 года ў вёсцы Языль Старадарожскага раёна. Удзел у ёй узялі 87 бегуноў. З цягам часу звычайны лёгкаатлетычны прабег, прысвечаны Дню работнікаў сельскай гаспадаркі і перапрацоўчай прамысловасці, перарос у адно з самых масавых мерапрыемстваў у краіне, якое збірае больш як 2000 аматараў лёгкай атлетыкі, — расказаў **намеснік старшыні Старадарожскага райвыканкама Дзмітрый ДАВЫДАЎ.** — Цяперашнюю назву фестываль атрымаў у 1992 годзе, а ў 1993-м з'явіўся яго сімвал — «Буслік».

14 верасня 2011-га траса прабегу на 10 кіламетраў была сертыфікавана Міжнароднай федэрацыяй лёгкай атлетыкі. У гэтым жа годзе ўпершыню праведзены карпарацыйны забег на тры кіламетры сярод арганізацый і прадпрыемстваў раёна.

Традыцыйна ў праграму спаборніцтваў уваходзяць забегі на 60 метраў для самых маленькіх, «Школьны камандны забег» на 2500 метраў.

На 30-м юбілейным фестывалі прадугледжаны новы забег — «Сямейная эстафета». Самым галоўным з'яўляецца забег на 10 кіламетраў, а самым масавым — «Карпарацыйны забег» на 2500 метраў. Арганізатарамі фестывалю ў намінацыі «Карпарацыйны забег» заснаваны прызы «Самая масавая каманда» і «Самая крэатыўная каманда». У ім таксама прымуць удзел прадпрыемствы і арганізацыі Мінскай вобласці.

Пераможцы атрымаюць медалі і грашовыя прызы.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.
lazovskaya@zviazda.by

Вынеслі мэблі на 44 тысячы

У Першамайскі РУУС сталіцы паступіла заява аб крадзяжы маёмасці на суму больш за 44 тысячы рублёў.

Два жыхары сталіцы 30 і 32 гадоў будавалі адзін з гандлёвых цэнтраў горада. Неяк працоўным днём вырашылі агледзець будынак. Выявіўшы ў ім склад, злымыснікі ўскрылі яго і ўбачылі дарагую мэблю. Вярнуўшыся ў цёмны час сутак на склад, мужчыны зноў праніклі ў памяшканне і ўкралі скураныя крэслы і драўляныя тумбачкі. Гэтую маёмасць яны адвезлі да знаёмага і схавалі ў падвале. Зараз мінчанам пагражае пазбаўленне волі на тэрмін да 12 гадоў з канфіскацыяй маёмасці. Раней мужчыны ўжо прыцягваліся да крымінальнай адказнасці.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

2 кастрычніка 2017 г. у 15.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 9) адбудзецца адкрыццё трэцяй сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання.

■ Развітанне

Пайшоў з жыцця вядомы кампазітар Дзмітрый Смольскі

Аўтар опер «Сівая легенда» па Уладзіміру Караткевічу, «Францыск Скарына» і «Апалон-заканадаўца», сімфоній, інструментальных канцэртаў, вакальнай музыкі і музыкі да фільмаў Дзмітрый Смольскі ва ўзросце васьмідзесяці гадоў пайшоў з жыцця. Пра гэта паведаміла музычны крытык Юлія Андрэева на сваёй старонцы ў Facebook.

Дзмітрый Смольскі нарадзіўся ў сям'і музыказнаўца Браніслава Смольскага і ўжо з сямі гадоў пачаў рэгулярна займацца музыкай. За яго плячыма школа пры кансерваторыі, Беларуская дзяржаўная кансерваторыя і аспірантура пад кіраўніцтвам прафесара Маскоўскай кансерваторыі Мікалая Пяйко. Са сваёй творчасцю Дзмітрый Смольскі яшчэ ў савецкія часы трапіў у «пераломныя» гады сучаснай музыкі, ён заўсёды вызначаўся цікавасцю да ўнутранага стану чалавека. Яго сімфоніі — асаблівы кірунак дзейнасці Дзмітрыя Браніслававіча — сталі важным этапам у кантэксце беларускага сімфанізму.

Савецкі і беларускі кампазітар за сваё жыццё атрымаў некалькі ганаровых узнагарод, сярод якіх званні заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі, народнага артыста Беларусі, Дзяржаўная прэмія Рэспублікі Беларусь, ордэн Францыска Скарыны. Апроч гэтага, кампазітар быў і прафесарам: да 2014 года ў Беларускай акадэміі музыкі ён выкладаў кампазіцыю.

Спачуванні родным і блізкім Дзмітрыя Смольскага выказаў кіраўнік краіны Аляксандр Лукашэнка

■ А не шкодзь!

Па дурніцу на дурніцу

Камера відэаназірання, устаноўленая ў прыватнай сядзібе, дапамагла вылічыць зладзюжку і нават вярнуць частку выкрадзенага.

44-гадовая жыхарка Казіміраўскай Слабодкі, што ў Жлобінскім раёне, нядаўна вярнулася з ЛПП. Зазірнуць за двухметровую агароджу суседа яе вымусілі дурніцы. Гэтую каштоўную ягаду некалькі гадоў вырошчвае мужчына на сваім прысядзібным участку. Уначы зламысніца пералезла праз плот, не спяшаючыся расклала 25 паўметровых высадкаў у прыгатаваныя загадзя мяшкі і знікла з імі. Між тым гаспадар быў навучаны ранейшымі выпадкамі крадзяжу з яго ўчастка і абсталяваў двор камерай назірання з функцыяй начнога бачання. Таму, выявіўшы недахоп раслін, ён адразу ж выклікаў супрацоўнікаў РАУС і паказаў відэазапіс, які і вывеў праваахоўнікаў на падазроную. Высветлілася, што частку выкрадзенага суседка паспела рэалізаваць. Досвед крадзяжоў у яе ўжо быў, і цяпер у дачыненні грамадзянкі зноў узбуджана крымінальная справа па «любімым» артыкуле.

Ірына АСТАШКЕВІЧ. *iost@zviazda.by*

■ Здарэнне

Памерла парадзіха і двое дзяцей

Упраўленнем Следчага камітэта па Мінскай вобласці праводзіцца праверка па факце смерці дваіх нованароджаных дзяцей і іх маці ў Беразіне.

Вечарам 28 верасня ў рэанімацыю раённай бальніцы была дастаўлена 29-гадовая жыхарка горада з кровацячэннем. Жанчыну ў цяжкім стане знайшла сваячка, якая выклікала хуткую дапамогу. Па адрасе без прамаруджвання прыбыла брыгада медыкаў. Але грамадзянка адмаўлялася ад шпіталізацыі. Яе даставілі ў бальніцу прымусова. Пра гэта паведаміла **афіцыйны прадстаўнік упраўлення Следчага камітэта па Мінскай вобласці Таццяна БЕЛАНОГ.**

Пры абследаванні пацыенткі было выяўлена, што яна нядаўна нарадзіла. Ды ўратаваць яе не ўдалося: праз некалькі гадзін яна памерла. Тым часам следча-аператыўная група выявіла ў ванным пакоі кватэры жанчыны дзвюх нованароджаных мёртвых дзяўчынак. Установлена, што жанчына скрывала цяжарнасць і не стаяла на медыцынскім уліку. Не звярталася яна і па медыцынскую дапамогу падчас родаў. Жанчына пражывала сумесна з мужам і шасцігадовым сынам. Следства праводзіць комплекс мерапрыемстваў, у межах якіх апытваюцца сваякі, суседзі, збіраюцца звесткі, якія характарызуюць сям'ю. Вынесены пастановы аб правядзенні судова-медыцынскіх даследаванняў для высвятлення прычыны смерці парадзіхі і яе малых: ці былі яны даношаныя, ці нарадзіліся жывыя.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ. *lazovskaya@zviazda.by*

НАСТАЎНІК — ПА-ЗА ЧАСАМ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У фінальную частку спаборніцтваў у кожнай прадметнай намінацыі выходзіць па адным прадстаўніку ад кожнай вобласці і сталіцы. Але ў суперфінал праходзяць толькі пераможцы ў сваіх намінацыях. Таму выхад маладога фізіка ў суперфінал дорага каштуе! Увогуле склад суперфіналістаў гэтым разам аказаўся вельмі цікавым. З васьмі ўдзельнікаў трое былі прадстаўнікамі Віцебскай вобласці: настаўніца беларускай мовы і літаратуры Баравухскай сярэдняй школы №15 з Наваполацка **Святлана РУМЯНЦАВА**, настаўнік біялогіі гімназіі №5 г. Віцебска **Марына ЮР'ЕВА** і настаўнік гісторыі сярэдняй школы №3 г. Оршы **Андрэй ІВАНОЎ.** Двое прадстаўлялі Міншчыну: **Максім ДУБІНА** з фаніпальскай сярэдняй школы №1 і выхавальніца дашкольнай установы адукацыі яслі-сад №24 горада Маладзечна **Таццяна АПАНОВІЧ.** Яшчэ двое — горад Ваўкавыск: настаўніца іспанскай мовы з гімназіі №2 **Юлія КАСТАЛОМАВА** і настаўніца пачатковых класаў гімназіі №1 **Людміла ЗАЯЦ.** Нават цяжка прыгадаць, каб адзін горад быў так моцна прадстаўлены ў суперфінале. Таксама за званне найлепшага ў прафесіі змагалася настаўніца музыкі сярэдняй школы №53 г. Мінска **Вольга МАХІТКА.**

За спінай ва ўсіх удзельнікаў былі два ўрокі, праведзеныя ў незнаёмай дзіцячай аўдыторыі (у тым ліку па тэме, якую журы агучыла напярэдадні выпрабавання), псіхолага-педагагічнае тэсціраванне і майстар-класы для будучых калег — студэнтаў педагагічных спецыяльнасцяў. Калі ў фінале мужчын-педагогаў было пятнаццаць, у суперфінале іх аказалася два. Але настаўнікі-мужчыны проста не могуць застацца незаўважанымі, хоць бы па прычыне сваёй эксклюзіўнасці ў школе. Так адбылося і на сцэне Акадэміі паслядыпломнай адукацыі, дзе яны адзначыліся і гумарам, і эрудыцыяй.

ФІЛАСОФІЯ ФІЗІКІ

Натуральна, што ўсе суперфіналісты конкурсу былі вельмі рознымі: кожны — са сваім арсеналам сродкаў, са сваімі сакрэтамі педагагічнага майстэрства і падыходамі да вучняў. У кагосьці атрымалася праявіць сябе найлепш у больш звыклай для настаўніка школьнай атмасферы, а хтосьці вызначыўся артыстычным талентам на сцэне Акадэміі паслядыпломнай адукацыі, як, напрыклад, настаўнік гісторыі з Оршы Андрэй Іваноў.

Дваццаціхвілінны ўрок, безумоўна, — самае яркае конкурснае выпрабаванне ў суперфінале. Усім удзельнікам была прапанаваная адна і тая ж тэма: «Каб знайсці сваё месца ў жыцці». Удзельнікі павінны былі раскрыць яе сродкамі свайго прадмета. Натуральна, што настаўніца музыкі спявала разам са сваімі вучнямі песню «Тыя, хто па жыцці да мэты імкнуцца, зроблены ў Беларусі...» Між іншым,

у ролі школьнікаў выступалі калегі па фінальнай частцы спаборніцтваў, якія з задавальненнем падыгрывалі і гумарылі на сцэне. Ну, а калі яшчэ сур'ёзным дарослым людзям давядзецца выступіць у ролі выхаванцаў дзіцячага садка, якія прымяраюць на сябе розныя прафесіі ці вучняў пачатковых класаў? «Пра што вы марыце?» — цікавіцца настаўніца? А далей сыплюцца адказы: «Паспаць!», «Стаць каралевай Англіі»... На ўроку беларускай мовы «вучні» шукалі адказ на пытанне «Што перашкодзіла калабку знайсці сваё месца ў жыцці?», а на ўроку гісторыі — «Як змянялася разуменне месца ў жыцці ў розныя гістарычныя эпохі?»

«У будучыні чалавеку давядзецца асвойваць мноства прафесій цягам жыцця, таму настаўнік будзе вучыць не чамусьці канкрэтнаму, а будзе вучыць вучыцца».

А вось як вызначыць крытэрыі паспяховасці з дапамогай фізікі? Аказваецца, можна... На стале ў вучняў — два магніты. Людзі, як тыя магніты, могуць прыцягвацца і адштурхоўвацца. Фізічнае паняцце «прыцяжэнне» трансфармуецца ў жыцці ў неабходнасць здзейсніць выбар: можна застацца на тым жа месцы, але вам давядзецца змяняцца, а можна не змяняць сябе, але змяніць сваё месца. Прыцяжэнне — выбар, які робіць кожны чалавек. Далей вучні даследавалі трываласць канструкцыі, на якую клалі зверху кнігі. «Калі эксперымент удасца паўтарыць, значыць, гэта заканамернасць», — каментуе дзеянні «вучняў» настаўнік. Усе канструкцыі зроблены з аднолькавага ліста, але ім нададзена розная форма. Усе пераконваюцца, што трываласць залежыць ад формы. «Гэты ліст можна параўнаць з нашымі магчымасцямі: калі мы свае магчымасці, здольнасці, рэсурсы будзем размяркоўваць правільна, то зможам вытрымліваць і большую нагрузку», — кажа педагог. Ну, а маленькая запалка, з дапамогай якой вучням дэманструецца закон раўнавагі, даказвае, што не важна, якое месца ты займаеш, галоўнае — усё рабіць добрасумленна.

СУПРАЦЬ «ГУЛЬНІ ТРОНАЎ»

Педагагічная прэс-канферэнцыя — конкурс, падчас якога патрабавалася прадэманстраваць не толькі педагагічную эрудыцыю, але і імгненную рэакцыю, бо ў штодзённай рабоце жыццё пастаянна падкідвае педагогам нестандартныя сітуацыі... На абдумванне адказу даецца 30 секунд. «Ці трэба ўводзіць дрэс-код для настаўніка?» — цікавіцца журы ў настаўніцы беларускай мовы. «Нам гэта не патрэбна, бо лепшае адзенне для чалавека — яго душа. Важна, з якой душой настаўнік заходзіць у клас, якімі вачыма глядзіць на вучняў, які пасыл нясе», — адказвае Святлана Румянцава.

«Ці магчыма выхаванне без прымусу?», «Якая формула поспеху сучаснага педагога?», «Што з'яўляецца галоўным крытэрыем майстэрства педагога?», «Адоранае дзіця — гэта падарунак для педагога ці выпрабаванне?», «Як даказаць дзіцяці каштоўнасць адукацыі?», «Назавіце адрозненне сучаснага педагога ад педагога XX стагоддзя...», «Як вы лічыце, чаму трэба вучыць сучасных педагогаў?» — пытанні сыплюцца на канкурсантаў. «Калі ўсе пішуць на разлінаванай паперы, трэба хоць раз узяць на сябе смеласць і напісаць упоперак», — кажа Андрэй Іваноў і зрывае апладысменты.

Апошні конкурс — публічнае выступленне на тэму «Настаўнік (выхавальнік): учора, сёння, заўтра» — пераўтвараецца ў прызнанне ў любові да сваёй прафесіі.

— Кажуць, што ўсе прафесіі — ад настаўніка, і толькі прафесія настаўніка — ад Бога, таму лічу не зусім справядлівым, што гісторыя памятае толькі імёны першаадкрывальнікаў: Гагарын, Архімед... На паліцах бібліятэк мы можам знайсці кнігі «100 найлепшых архітэктараў», «100 найлепшых музыкантаў», «100 найлепшых мастакоў», але вы там не знойдзеце томіка «100 найлепшых педагогаў». І нават у самай старажытнай кнізе мы не знойдзем імя першага настаўніка. А можа, так і павінна быць? — разважае настаўнік пачатковых класаў Людміла Заяц. — Няўжо можна выдзеліць са шматтысячнай арміі адданых сваёй справе хоць бы сотню найлепшых? А імя першага настаўніка, бясспрэчна, жыве ў сэрцах яго ўдзячных вучняў. Любіць дзяцей такімі, якія яны ёсць, — найвышэйшае майстэрства.

— Падручнік гісторыі канкурыруе сёння з бестселерамі і серыялам «Гульня тронаў». Дык, можа, спыніць канкурэнцыю і здацца? Канешне, не, бо не яны, а мы павінны выхоўваць нашых дзяцей. У маім разуменні ўрок гісторыі — гэта дыялог паміж настаўнікам і вучнямі ў працэсе даследавання і вырашэння праблемы, скіраванай на абуджэнне гістарычнай памяці, — дзеліцца сваім бачаннем Андрэй Іваноў.

— Мы жывём у час пераасэнсавання статусу і ролі кожнага ўдзельніка адукацыйнага працэсу. З кожным бітам інфармацыі ў свеце сёння становіцца ўсё больш і больш, а знаходзіць яе — усё прасцей і прасцей. У два клікі можна атрымаць любую інфармацыю. Таму настаўнікі заўтрашняга дня не будуць імкнуцца да таго, каб вучань засвоіў нейкую інфармацыю. Яны будуць рабіць так, каб вучань навучыўся з ёй працаваць. У будучыні чалавеку давядзецца асвойваць мноства прафесій цягам жыцця, таму настаўнік будзе вучыць не чамусьці канкрэтнаму, а будзе вучыць вучыцца, — упэўнены Максім Дубіна.

ЛЁГКА НЕ БУДЗЕ

На думку Святланы Румянцавай, нішто так не палоніць, як прыгажосць, нішто так не пераконвае, як праўда, і нішто так не ўздзейнічае, як асабісты прыклад: «Мы імкнёмся сёння зарэкамендаваць сябе як вартыя павагі прафесіяналы, якія спалучаюць розум даследчыка, гнуткасць дыпламата, перакананасць палітыка, вытрымку разведчыка і талент акцёра. Каб дасягнуць усяго гэтага, вельмі многа працуем над сабой, вучымся, развіваемся, імкнёмся да самаўдасканалення. Настаўнікі заўтрашняга дня павінны ісці на крок наперадзе, таму што прафесія настаўніка і праз 20, і праз 220 гадоў будзе прад'яўляць чалавеку звышпатрабаванні. Усё, чаму вучыць настаўнік, павінна быць у ім самім, бо розум выхоўваецца толькі розумам, высакароднасць — асабістай высакароднасцю, патрыятызм — любоўю да радзімы і адданасцю ёй. Прафесія настаўніка ніколі не была і не будзе лёгкай, таму што заўсёды патрабуе ад чалавека вялікіх разумовых і духоўных затрат, але гэта і самая ўнікальная прафесія, якая па-за часам, модай і геаграфіяй...»

Па рашэнні «дарослага» журы, менавіта Святлана Румянцава і становіцца новым уладальнікам звання «Настаўнік года». **А рашэнне дзіцячага журы схілілася на карысць выхавальніцы дзіцячага садка Таццяны Апановіч.**

Ну ўроку беларускай мовы «вучні» шукалі адказ на пытанне «Што перашкодзіла калабку знайсці сваё месца ў жыцці?», а на ўроку гісторыі — «Як змянялася разуменне месца ў жыцці ў розныя гістарычныя эпохі?»

Святлана Румянцава прызналася, што самым складаным выпрабаваннем у фінале для яе было псіхолага-педагагічнае тэсціраванне: «Напэўна, сіндром выдатніцы праявіўся. Не на ўсе пытанні я змагла адказаць, а потым яшчэ вельмі доўга вечарам і на наступны дзень рэфлексавала — мне шмат чаму яшчэ трэба вучыцца. А ў суперфінале я проста атрымлівала задавальненне: ад кантактаў з калегамі і залай, бо мара — стаць суперфіналістам — была ўжо дасягнутая. Усе суперфіналісты — сапраўдныя майстры сваёй справы. Мяне перапаўняюць розныя эмоцыі: гэта адначасова і хваляванне, і радасць. А таксама вялікая адказнасць перад калегамі і вучнямі. Гэта гонар для мяне і для ўсёй сістэмы адукацыі Віцебскай вобласці. Мая перамога — пацвярджэнне таго, што я раблю патрэбную справу, а таксама духоўнай пераемнасці ў маёй педагагічнай дынастыі».

Трэба дадаць, што матуля пераможцы выкладала матэматыку ў школе, яе сёстры — таксама настаўніцы (выкладаюць хімію, біялогію і геаграфію). А дачка толькі рыхтуецца прыйсці да вучняў: зараз яна студэнтка пятага курса Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта. Марыць стаць настаўніцай англійскай мовы. Таму дынастыя хутка атрымае працяг...

Надзея НІКАЛАЕВА.
nikalaeva@zviazda.by

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

■ Святкуйма!

Віцебшчына ўшаноўвае хлебаробаў

У Дуброўне сёння праходзіць абласны фестываль — кірмаш «Дажынкі-2017» працаўнікоў вёскі Віцебскай вобласці. Арганізатары гарантуюць, што ўсе на святе — перадавікі сельскай гаспадаркі з розных рэгіёнаў, тутэйшыя і турысты — атрымаюць масу прыемных уражанняў.

Напярэдадні на адной з тэматычных нарад у аблвыканкаме **Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ, старшыня абласнога Савета дэпутатаў,** падкрэсліў, што трэба зрабіць, каб удзельнікі фэсту адчулі ўрачыстасць з вялікай літары. Ён нагадаў, што менавіта на «Дажынках» можна дакрануцца да мінулага — традыцыі, якая з'яўляецца адной з каштоўнасцяў беларусаў. Ва ўсе часы наш народ паважаў добрасумленных і старанных працаўнікоў. І павага да хлеба, нялёгкіх намаганняў нашых кармільцаў для беларускага народа не проста прыгожыя словы. «Дажынкі» без перабольшвання народнае свята.

І, зразумела, асаблівы гонар для жыхароў раёна, дзе праводзіцца чарговы кірмаш, паказаць гасцям добраўпарадкаваныя населеныя пункты. Як і вітаць кожнага прыезджага гасцінна.

Многае зроблена ў сталіцы фестывалю. У час падрыхтоўкі навялі бляск на дзясятках аб'ектаў жылога фонду, грамадскага прызначэння. Прэзентуюць і новыя. У прыватнасці, сёння ганарова адкрываецца «Фантан сустрэч», дзіцячая пляцоўка. У Дуброўне таксама адчыняюць дзверы загс, банкаўскі разлікова-касавы цэнтр. «Разыначка» святкавання — прэзентацыя праектаў «Добраўпарадкаваная вёска», «Дуброўне — горад, дзе мы жывём», «Дуброўне — горад, дзе мы хочам жыць», «Дуброўне — горад, дзе мы любім адпачываць», «Дуброўне — горад, дзе мы любім вучыцца», «Дуброўне — горад, дзе мы любім працава

ПАЖЫЛЫЯ ЗМОГУЦЬ ЖЫЦЬ У ЗАМЯШЧАЛЬНАЙ СЯМ'І

Задача дзяржавы — забяспечыць людзям годную старасць

Старасць бывае вельмі рознай, у тым ліку шчаслівай і не вельмі. Самы аптымальны варыянт для пажылога чалавека — гэта той выпадак, калі ён выгадаваў добрых дзяцей і яны жывуць дзесьці непадалёк. Але так бывае не заўсёды. Дзеці часта пакідаюць роднае гняздо і з'язджаюць жыць у іншы горад ці нават іншую краіну. А самая ўразлівая катэгорыя пажылых людзей — гэта адзінокія людзі. Місія дзяржавы — абараніць іх і забяспечыць ім годную старасць, зрабіць так, каб пажылы чалавек не застаўся са сваімі праблемамі сам-насам. Дык якую дапамогу можа прапанаваць дзяржава?

Многія людзі, якія выйшлі на пенсію, яшчэ поўныя сіл і энергіі. Але пры гэтым іх энергія застаецца незапатрабаванай. Здавалася б, ёсць і дзеці, і ўнукі, але ўсе яны ўжо жывуць сваім жыццём... І многія нават вельмі паспяховыя пажылыя людзі пачынаюць адчуваць прыхаваную адзіноту.

Для такой катэгорыі людзей трэцяга ўзросту існуюць аддзяленні дзённага знаходжання для пажылых пры тэрытарыяльных цэнтрах сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва.

— Прыходзяць у такія аддзяленні грамадзяне ад 60 і да 80 і больш гадоў, верхняй планкі па ўзросце няма, — кажа **загадчыца аддзялення дзённага знаходжання для грамадзян пажылога ўзросту Светлагорскага ТЦСАН Валянціна ПІНЧУК**. — Але гэта павінны быць людзі, якія самі сябе абслугоўваюць і ў стане наведваць аддзяленне самастойна. У нашым аддзяленні, напрыклад, самы пажылы — 81-гадовы мужчына, а самыя маладыя — тыя, каму споўніўся 61 год. Але ёсць і дзве 59-гадовыя жанчыны, якія цяпер прыходзяць да нас у якасці валанцёраў, з перспектывай залічэння сюды ў будучым. Усяго наша аддзяленне наведваюць 36 чалавек. Галоўнае ў нас — гэта сацыяльная адаптацыя пажылых, згуртаванне, стасункі, абмен жыццёвым вопытам. Тут у нас, калі можна так сказаць, клуб стасункаў, клуб па інтарэсах. Людзі займаюцца ў розных гуртках, авалодваюць камп'ютарнымі навыкамі. А самай запатрабаванай у нас аказалася — што б вы думалі? — фізкультура.

***

Калі чалавек у гадах ужо не ў стане самастойна спраўляцца з шэрагам абавязкаў па самаабслугоўванні, жыве адзін (дзяцей няма ці яны далёка), мясцовы тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва па месцы жыхарства можа прапанаваць яму два віды дапамогі: разавыя сацыяльныя паслугі (вымыць акно, ускапаць агарод) або рэгулярную дапамогу сацыяльнага работніка. Прычым паслугі, гарантаваныя дзяржавай, чалавек можа атрымаць усюды, у якім бы месцы нашай краіны ён ні пражываў.

Калі пажылы чалавек стаў адчуваць сябе горш, але не хоча пакідаць родны дом, яму прапаноўваецца нестацыянарнае абслугоўванне. Яго можа абслугоўваць сацработнік дома, альбо некалькім пажылым людзям прапануецца з'ехацца і жыць разам у адным доме і разам весці гаспадарку, а тэрытарыяльны цэнтр сацабслугоўвання насельніцтва аказвае ім усю неабходную дапамогу і падтрымку.

Пры гэтым у нашай краіне пастаянна ўкараняюцца новыя формы

Фота носіць ілюстрацыйны характар.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

сацыяльнага абслугоўвання. Адна з апошніх навінак — замяшчальная сям'я. Гэтая навацыя прадугледжана законам «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб сацыяльным абслугоўванні», які ўступіць у сілу 25 снежня гэтага года. І, як сказаў на нядаўняй прэс-канферэнцыі **намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Аляксандр РУМАК**, міністэрствам ужо распрацавана палажэнне аб замяшчальнай сям'і для пажылых людзей. Гэтая паслуга будзе аказвацца на дагаворнай аснове, а памочнік пажылога чалавека ў замяшчальнай сям'і зможа атрымліваць узнагароджанне. Пры гэтым, калі ў сям'ю прыняты адзін пажылы чалавек, узнагароджанне будзе складаць да 100% бюджэту пражытковага мінімуму, калі двое — да 150%.

***

Калі пажылому чалавеку з цягам часу стала яшчэ больш складана даглядаць сябе, але пры гэтым ён усё ж у стане сябе абслугоўваць — можа звярнуцца ў аддзяленне кругласутачнага знаходжання. Такія аддзяленні створаны па ўсёй краіне, усяго іх на сённяшні дзень — 63.

— Аддзяленне кругласутачнага знаходжання прадастаўляе пажылым непрацаздольным грамадзянам і інвалідам 1—2 групы жыллё з поўным матэрыяльна-бытавым забеспячэннем, гэта фактычна кругласутачны догляд, — тлумачыць **намеснік дырэктара Светлагорскага ТЦСАН Алена КАЦУБА**. — У ім ёсць пост медсястры, сацыяльны работнік. Раней людзі, якія там знаходзіліся, плацілі за сваё знаходжанне 80% ад пенсіі. Цяпер плата залежыць ад сабекошту. І калі чалавек не з'яўляецца адзінокім, то дзеці павінны плаціць за яго знаходжанне поўную суму. Але адзінокі чалавек плаціць па-ранейшаму пэўны працэнт ад пенсіі.

Калі пажылы чалавек пачынае мець патрэбу ў пастаянным доглядзе, ён можа атрымліваць такі догляд дома. Яго сваяк, суседка або нехта іншы з знаёмых людзей можа афармліцца адпаведным чынам і ажыццяўляць догляд і атрымліваць дапамогу па доглядзе інваліда першай групы або пажылога чалавека, якому больш за 80 гадоў.

— Але ў жыцці бываюць розныя сітуацыі, дапусцім, такая, калі чалавеку 78 гадоў, ён адзінокі і па стане здароўя не можа ўжо абслугоўваць сябе, але пры гэтым не мае першай групы інваліднасці, а мае, скажам, другую групу, — кажа Алена Кацуба. — Як можна яму дапамагчы ў гэтым выпадку? Сацыяльная служба, якая выявіла такога чалавека, перадае яго даныя медыкам, і тыя або глядзяць, ці можна яму даць першую групу інваліднасці, або прапануюць яму афармліцца на сацыяльную койку. Такі падыход прымяняецца, калі ў чалавека бязвыхадная сітуацыя. Напрыклад, дрэнны стан здароўя і пры гэтым даглядаць яго няма каму: дзяцей або няма, або яны жывуць дзесьці далёка, напрыклад, у Расіі, ці дзеці самі ўжо непрацаздольнага ўзросту. Або чалавека можна афармліць у інтэрнат — вельмі важна, што ён мае права выбару.

А самае галоўнае, па словах нашых субяседнікаў, — сацыяльныя паслугі сёння даступныя для любога, хто мае ў іх патрэбу.

Толькі факты

✓ **Сацыяльную дапамогу дома атрымліваюць амаль 90 тыс. непрацаздольных жыхароў Беларусі, 44,5% з іх — ва ўзросце 80 гадоў і старэйшыя.**

✓ **Каля 2 тыс. чалавек, якія з розных прычын не могуць пражываць самастойна, абслугоўваюцца ў 64 аддзяленнях кругласутачнага знаходжання.**

✓ **На ўліку ў 146 ТЦСАН — больш за 1,9 млн чалавек, з іх 134,3 тыс. — адзінокія пажылыя людзі, 612,8 тыс. — адзінока пражываючыя старыя.**

✓ **У 70 дзяржаўных дамах-інтэрнатах для састарэлых і інвалідаў пражываюць 17 тыс. чалавек.**

«У МЯНЕ ХВІЛІНКІ ВОЛЬНАЙ НЯМА!»

Калі сядзець увесь час з мужам дома і глядзець тэлевізар, у рэшце рэшт пачняце сварыцца...

Як сказала Фаіна Ранеўская, наша будучыня — старасць. І гэта не так ужо і страшна, тым больш што, якой яна будзе — шмат у чым залежыць ад самога чалавека.
Дарэчы, усё ж, які ён, сучасны трэці ўзрост? Як выглядаюць, апранаюцца, жывуць сучасныя пенсіянеры? У беларускай старасці — у асноўным жаночы твар, таму мы пагаварылі з трыма абаяльнымі прадстаўніцамі трэцяга ўзросту з горада Светлагорска. Перад вамі — тры маналогі, у якіх пазнае сябе не адна жанчына.

Тамара КАЗЛОВА, 65 гадоў

Я калісьці працавала кандуктарам у аўтапарку. Выйшла на пенсію ў 55 гадоў. Жыву адна. Усё было — і нічога не стала. Спачатку муж памёр, 27 гадоў таму, а потым сын (на яе вочы наварочваюцца слёзы). Мы з мужам прыехалі сюды калісьці з Расіі, па накіраванні Міністэрства рачнога транспарту. Муж быў выкладчыкам у тэхнікуме. Наш малодшы, Коля, паступіў без экзаменаў у Марскую акадэмію і ўжо заканчваў яе, але на 6 курсе яго не стала.

Застаўся яшчэ адзін сын, ёсць унук, якому цяпер сем гадоў. Сын з сям'ёй жыве тут жа, у Светлагорску, але на работу ездзіць ва Узбекістан. Ён геадэзіст.

Лічу, што ў жыцці самае каштоўнае — зносіны. Мы, пенсіянеркі, збіраемся ў нашым тэрытарыяльным цэнтры сацыяльнага абслугоўвання два разы на тыдзень, а ў астатнія дні, бывае, на вуліцы сустрэнемся, спынімся, пагаворым адна з адной... Мяне ў ТЦСАН прывяла сяброўка. Яна ў нас у тэхнікуме працавала калісьці вахцёрам, мы з ёй ужо 30 гадоў як сябруем.

Вы не паверыце, але дома ў мяне хвілінкі вольнай няма! Прачынаешся, паснедаеш, потым у краму, часам у паліклініку. Далей на гурток ці, вось, напрыклад, цяпер вяжу кручком. Я раней не ўмела чытаць схемы. Цяпер вось вучуся. Хачу сплесці сабе капялюшык да лета *(какетліва ўсміхаецца)* ...Так і дзень праходзіць.

Нават і не ведаю: як мы раней, працуючы, усё паспявалі? Тады ўсё было ў тэмпе, званок будзільніка празвіней — і паляцела! У мяне ўсё было выверана ледзь не па секундах. Ад дома да прыпынку — 4 хвіліны... А зараз... Паспела нешта зрабіць — добра, не — дык заўтра зраблю.

Ларыса ГАЛАВАНАВА, 73 гады

Я ўжо 28 гадоў на пенсіі, сышла з работы ў 45. На «Хімвалакне» працавала, таму ў мяне «шкодны стаж». 20 гадоў глядзела хворую маму, што была паралізаваная. Яна ў мяне была пісьменнай жанчынай, цікавілася ўсім, толькі што ляжачая была.

Цяпер вось хаджу ў розныя гурткі ў ТЦСАН, наведваю клубы «Дачнік», «Сустрэча сяброў». У апошнім клубе ў нас і артысты выступаюць, і дыскатэкі бываюць!

Мы жывём удваіх з мужам, дзеці ў Расіі. Прыязджаюць, дапамагаюць, чым могуць. Мужу майму ўжо 80, ён сядзіць дома, але ва ўсім мяне падтрымлівае.

У цэнтры сацыяльнага абслугоўвання ў нас фітнес, трэнажоры. Дома займацца гімнастыкай ляную, а тут з задавальненнем і адчуваю такую бадзёрасць пасля заняткаў!

Я таварыскі чалавек, у мяне шмат сяброў. Інтэрнэтам валодаю: чытаю навіны, а калі мяне нешта зацікавіць канкрэтна — задаю пытанне ў «Яндэксе». Нядаўна вось зацікавілася, чым карысныя грыбы. Зачытала мужу ўласцівасці кожнага грыба — і мы тут жа адправіліся ў лес. Апошнім часам кожны дзень туды хадзілі — па два вядры кожны раз прыносілі. Вельмі шмат сёлета грыбоў! Замарожваем іх, але стараемся не марынаваць — я баюся батулізму. А так — я ўжо ікру грыбную рабіла, сушыла, ваўнянкі саліла...

А вось гатаваць не люблю. Гатуе ў нас дома муж.

Галіна ЧУРАКОВА, 62 гады

Я пайшла на пенсію ў 57 гадоў. Якраз у гэты час у мяне пачаўся артроз ног, так што працаваць далей было цяжка. Работа ў мяне была — увесь час бегам, такой хуткасці яна патрабавала! Я абслугоўвала на цэлюлозна-папяровым камбінаце паток цэлюлозы і макулатуры, з якой рабілі паперу. Увогуле, працавала, колькі магла, а калі стала ўжо зусім цяжка, пакінула працу.

Вядома, пазбаўленне ад працоўных абавязкаў — гэта быў вялікі плюс. А мінус — аказалася, асабліва спачатку, што мне цяпер няма куды ісці. Уявіце: чалавек быў увесь час заняты, а потым рэзка ў яго з'яўляецца шмат вольнага часу. І надыходзіць пенсійная дэпрэсія, калі не ведаеш, куды сябе падзець.

І я стала шукаць месцы, куды я магу пайсці і правесці там свой час. Мая знаёмая арганізавала клуб агароднікаў, прысвечаны арганічнаму земляробству. І мы, члены клуба, раз на тыдзень збіраемся і абмяркоўваем там усё: спачатку свае агародныя тэмы, потым плаўна пераходзім да гумару, п'ём гарбату, можам праспяваць што-небудзь... Адзначаем разам святы, дні нараджэння. І гэта ўсё займае прастору пустэчы, што ўтварылася з выхадам на пенсію.

Затым мы даведаліся, што і ў тэрытарыяльным цэнтры сацабслугоўвання можна збірацца і размаўляць. Прыйшлі і сюды — і шмат чаму навучыліся тут. Я зрабіла прыгожае дрэва з сурвэтак і падарыла яго ўнучцы. Навучылася дэкупажу, шыццю з абрэзкаў...

Я і ў маладосці займалася рукадзеллем: шыла, вязала для сваіх дзетак, таму што атэлье было дорага, а тканін было навалам. А цяпер асвойваю тое, што ў маладосці не ўмела рабіць, і займаюся ўпрыгожваннем свайго дома і дачы. У мяне ўжо даўно была блакітная мара — навучыцца вышываць стужкамі, і вось яна спраўдзілася. Для нашага ўзросту гэта наогул знаходка: стужка ж гэта не тоненькая нітачка, што добра пры нашым зроку — акуляры надзенеш і ўсё бачыш. Галоўнае — праявіць фантазію!

Яшчэ мая аддушына — маленькая ўнучка. У сына работа вахтавая, ён месяц там, месяц дома. Нявестка заканчвае работу ў 6 гадзін. Так што я магу забіраць сваю ўнучку ўвечары з дзіцячага садка, у выхадныя гуляю з ёю. Гэта такая радасць! А старэйшыя ўнукі ўжо вучацца ў Мінску. Яны любяць печыва, пірагі — значыць, я зноў запатрабаваная, таму што мама працуе цэлымі днямі і ёй не да гэтага. І я фантазірую з выпечкай, каб іх пацешыць. Ну і грошай трэба ім з сабою крыху даць *(смяецца)*. І ў грыбы хочацца схадзіць, нягледзячы на хворыя ногі, і перапрацаваць усё, што вырасла на агародзе. Таму цяпер у мяне жыццё віруе!

Матэрыялы падрыхтавала Святлана БУСЬКО. *busko@zviazda.by*

Сумесны праект газеты «Звязда» і Міністэрства ўнутраных спраў

ФАРПОСТ СПАКОЮ

№9 (40)

■ Даслоўна

Генадзь КАЗАКЕВІЧ:

ВАРТА ДАКЛАДНА ЗРАЗУМЕЦЬ: НАРКОТЫК — ШЛЯХ У НІКУДЫ

Наш карэспандэнт пагутарыў з начальнікам Галоўнага ўпраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі МУС Рэспублікі Беларусь Генадзем КАЗАКЕВІЧАМ, каб высветліць, як наша заканадаўства рэагуе на з'яўленне новых рэчываў, ці рэальная ў нашай краіне легалізацыя «лёгкіх» наркотыкаў, а таксама што больш важна — асабістая свабода альбо асабістая бяспека.

Злачынства і пакаранне

— У грамадстве сёння абмяркоўваецца такое пытанне: ці аб'ектыўна прызначаць аднолькава суровыя тэрміны за любое ўзаемадзеянне з «лёгкімі» і «цяжкімі» наркотыкамі? Ці павінен быць падзел?

— Такі падзел існуе. Я лічу, што праблема дастаткова актуальная. Але глядзіце, якую катэгорыю насельніцтва гэтае пытанне цікавіць? Абсалютна канкрэтную — гэта сваякі асуджаных на працяглыя тэрміны, перш за ўсё, за распаўсюджванне наркотыкаў. Адбывае пакаранне за такое злачынства крыху больш за пяць тысяч чалавек. Не 15 тысяч, як кажуць і пішуць. Так, сярод іх ёсць дастаткова вялікія тэрміны, але пры гэтым ніхто не кажа пра тое, што ўжо даўно сышлі ад татальнага асуджэння ў выглядзе пазбаўлення волі па частцы першай артыкула 328. Нагадаю, у артыкуле па незаконным абароце наркотыкаў пяць частак. Прычым, без мэты збыту — гэта толькі першая частка, у адрозненне ад астатніх, дзе пералічаныя і розныя абставіны, напрыклад — групы, лабараторыі.

Што да «лёгкіх» і «цяжкіх» наркотыкаў: у Беларусі заўсёды быў падзел на небяспечныя і асабліва небяспечныя наркатычныя сродкі і псіхатропныя рэчывы. У залежнасці ад гэтага заканадавец і вызначыў памер абцяжваючых віну абставін. У нашым заканадаўстве гэта ўжо ёсць. Самыя вялікія тэрміны атрымліваюць не за тое, што чалавек «патрымаў у руках» ці ўжыў, не. Мы выдатна разумеем, што нарканан — гэта хворы чалавек. Яго трэба спачатку лячыць, а потым караць. Але самыя вялікія тэрміны атрымліваюць тыя, хто замяшаны ў абароце.

— Гэта значыць, пакуль ніякія змены ў заканадаўстве не плануюцца? Бо сапраўды бываюць людзі — няхай гэта і рэдка здараецца, — якія выпадкова сталі на гэты шлях, а адразу атрымалі сур'ёзныя тэрміны.

— За мінулы год асуджаным, якія знаходзяцца ў месцах пазбаўлення волі, больш за 400 разоў была ўжыта замена пакарання больш мяккім ці ўмоўна-датэрміновым вызваленнем. Наша заканадаўства прадугледжвае і прымяняе магчымасць выпраўлення ў месцах пазбаўлення волі. Калі адміністрацыя бачыць, што асуджаны цвёрда стаў на шлях выпраўлення, мае намер сацыялізавацца, то варыянты ёсць. І, што паказальна, да гэтай катэгорыі такія варыянты прымяняюцца значна часцей, чым да іншых. І гэтыя хадайніцтвы задавальняюцца больш, чым на 80 працэнтаў. Што датычыцца змяненняў заканадаўства, то цяпер адпаведнае пытанне прапрацоўваецца. Справа ў тым, што гэта вельмі сур'ёзны крок, які мае сур'ёзныя наступствы.

— Сёння некаторыя актывісты выступаюць за легалізацыю «лёгкіх» наркотыкаў. Як вы да гэтага ставіцеся, і ці рэальны такі крок?

— Скажыце, а навошта гэта трэба? Зняць стрэс, расслабіцца — так, такія матывы ёсць, і іх дастаткова шмат. Але ёсць памылковы погляд, што дзесьці ў свеце лёгкія наркотыкі легалізаваныя. Толькі ў нешматлікіх краінах у свеце легалізаваная марыхуана. Але давайце падумаем, да чаго гэта прыводзіць? Па-першае, злоўжыванне. Па-другое, калі грамадзянін не можа справіцца са стрэсам, ёсць і маса іншых спосабаў гэта зрабіць — спорт, музыка, сябры. Акрамя таго, ужыванне, скажам так, «лёгкіх» наркотыкаў — гэта толькі першая ступень. Далей — больш цяжкія рэчывы. Таму мы катэгарычна супраць і гатовыя на любым узроўні абгрунтоўваць сваю пазіцыю ў гэтай частцы.

Свабода ці бяспека?

— Ці паспявае заканадаўства своечасова адаптавацца да з'яўлення новых відаў наркотыкаў?

— Беларускае заканадаўства пабудавана па наступным прынцыпе: калі ў 2014 годзе з'явіўся Дэкрэт №6, у адпаведным законе мы ўвялі паняцце «базавая структура». На самай справе, новыя наркотыкі — гэта толькі нязначнае змяненне хімічнай формулы. Сама структура рэчыва як была, так і засталася. Адпаведна, мы пайшлі па такім шляху, каб крыміналізаваць гэтую ўмову. І беларускае ноу-хау, якое прызнаецца ўсёй сусветнай супольнасцю, — гэта тое, што наша заканадаўства здольна крыміналізаваць новае рэчыва яшчэ да таго, як яно з'явілася на рынку. Гэта значыць, калі ў Германіі для ўнясення ў спіс забароненых рэчываў патрэбныя месяцы, то ў нас — два-тры дні. Таму ў Беларусі новыя рэчывы амаль і не з'яўляюцца. Цяпер у нас забаронена да 98% усіх магчымых новых рэчываў, а гэта значны вынік. Наша заканадаўства ў гэтым плане з'яўляецца адным з найбольш прагрэсіўных.

— Як за апошні час змяніўся трафік забароненых рэчываў праз Беларусь?

— Пагроза захоўваецца, паколькі Беларусь з'яўляецца як краінай паходжання, так і краінай спажывання, а таксама транзіту — як з Еўропы на Усход, так і ў адваротным напрамку. Напрыклад, толькі сёлета ў нас было два буйныя затрыманні па гашышы — партыі больш за 70 кілаграмаў і 40 кілаграмаў. Гэта мараканскі гашыш, які праз Еўропу ішоў у напрамку Расіі. Гэта значыць, пагроза сапраўды існуе. Ёсць такое паняцце — спынены канал пастаўкі наркотыкаў і псіхатропаў. Дык вось, колькасць такіх каналаў расце год ад году, цяпер іх ужо 35.

— Злачынныя арганізацыі, якія займаюцца наркабізнесам ў Беларусі, — гэта лакальныя або міжнародныя аб'яднанні?

— Для таго каб разумець структуру арганізацыі, трэба дакладна разумець механізм распаўсюджвання наркотыкаў, галоўным чынам у інтэрнэце. Што ўяўляе сабой гэты механізм? Раней у інтэрнэце ствараліся сайты, умоўныя гандлёвыя пляцоўкі. Цяпер, з улікам таго, што мы спынілі такія рэчы, сістэма змянілася. Інтэрнэт-крамы сышлі ў даркнэт. Сама форма змянілася — гэты кантэнт можа ўяўляць сабой закрытую ветку ў сацыяльнай сетцы. Акрамя таго, з'явілася новая форма камунікацыі з элементамі шыфравання — перш за ўсё, гэта месенджары. І гэта дазваляе арганізатару нават не ўваходзіць у прамы кантакт не тое, што са спажыўцамі, а нават з распаўсюджвальнікамі. Гэта значыць, злачынцы, якія знаходзяцца на вяршыні піраміды, нават у Беларусі не з'яўляюцца. Акрамя таго, грошы за наркотыкі пераводзяцца праз электронныя кашалькі. Злачынныя групоўкі ёсць, але ў Беларусі пра іх казаць у сувязі з названымі прычынамі не даводзіцца. Тым не менш колькасць распаўсюджвальнікаў не расце. Таксама мы перарываем дзейнасць арганізаваных злачынных груповак — вышэйшых формаў, а яны маюць ярка выражаны міжнародны характар.

Фота БЕЛТА.

Дарэчы, нядаўна ў выніку сумеснай спецаперацыі МУС, КДБ і расійскай ФСБ была спынена дзейнасць міжнароднай групоўкі, якая займалася вытворчасцю метадону. Удалося ўстанавіць, што арганізатар лабараторыі, жыхар Магілёва, фактычна быў асноўным пастаўшчыком метадону ў нашу краіну. Непасрэдна сінтэзам наркотыкаў займаліся двое яго паплечнікаў, таксама магілёўцаў, у арандаваным прыватным доме ў Падмаскоўі. У выніку ўсе былі затрыманыя, а ў здымным катэджы канфіскавана больш за 27 кілаграмаў крышталічнага рэчыва з вадкасцю, якая мае высокую канцэнтрацыю метадону, звыш 200 кілаграмаў прэкурсораў, забароненых да свабоднага абароту, а таксама лабараторнае абсталяванне.

— Не так даўно ў Расіі спецслужбы запатрабавалі адкрыць доступ да аднаго папулярнага месенджара з-за магчымай тэрарыстычнай пагрозы. Як вы лічыце, ці не парушае гэта асабістую недатыкальнасць чалавека?

— Тут узнікае канфлікт: што для грамадства больш прымальна? Альбо паняцце асабістай свабоды, альбо паняцце асабістай бяспекі. Але мы пакуль такое пытанне не ставім і спрабуем справіцца тым аператыўна-вышуковым інструментарыем, які ў нас ёсць. Расіяне паставілі пытанне даволі жорстка, аднак вось атрымаюць яны доступ да аднаго сэрвісу, але ж ёсць і дзясяткі іншых — і што тады? Пытанне гэта не вырашыць. Аб гэтым можна будзе казаць, калі грамадства дасць выразную ацэнку. Як гэта высветліць? Трэба спытаць. Адна з новых формаў узаемадзеяння — гэта адкрытасць нашай службы, людзі павінны разумець нашы задачы. Мы будуем сваю работу такім чынам, каб максімальна поўна і адкрыта ўзаемадзейнічаць з любымі пластамі грамадства, а таксама наладзіць зваротную сувязь.

Затрымаць у пачатковай стадыі

— Якія меры прафілактыкі ўжывання наркотыкаў рэальна працуюць?

— Давайце пачнём з іншага: а вы ведаеце, што з моманту ўвядзення новага заканадаўства ў 2014 годзе колькасць наркаманаў, якая ў нас знаходзіцца на ўліку, зменшылася з 17 тысяч да 14 тысяч? Гэта вельмі шмат. Колькасць перадазіровак зменшылася ў разы — толькі ў гэтым годзе ў параўнанні з мінулым яна зменшылася на 45%. У нас не дапушчана ні адной смерці непаўналетняга сёлета. Вось прыклад таго, як працуе прафілактыка. Прычым, мы не толькі зрабілі больш жорсткімі законы, мы вызначылі канкрэтныя меры для прафілактыкі. Усе ведамствы і міністэрствы аб'яднаныя адным матывам — супрацьдзеянне наркотыкам. Прыклад такіх мер? Мы прыходзім у школы, вышэйшыя навучальныя ўстановы і «на пальцах» тлумачым, чым небяспечнае ўжыванне.

Акрамя таго, анансую навінку. Мы ідзём па яшчэ адному шляху: выступілі ініцыятарам з'яўлення інфармацыйнага рэсурсу, які будзе ўяўляць сабой сайт, дзе інфармацыя будзе падавацца па трох кірунках для розных катэгорый грамадзян. Першая катэгорыя — для наркаманаў, другая — для «групы рызыкі», людзей, якія патэнцыйна могуць пачаць прымаць наркотыкі, трэцяя — для сузалежных, маці, жонак, сяброў. І мы будзем пачынаць не з крымінальнай адказнасці, а з таго, дзе можна атрымаць дапамогу. Вось трапіў у бяду блізкі, а на сайце будзе паказаная інфармацыя аб любым відзе медыцынскай дапамогі па найбліжэйшым адрасе. Таксама на гэтым жа сайце будзе ўся інфармацыя па прафілактыцы — пачынаючы ад адказнасці і заканчваючы шкодай. Тут з'явіцца нават гульні, частка сайта будзе інтэрактыўнай. Яшчэ адна галіна сайта — гэта зваротная сувязь. Сюды могуць пісаць усе — пачынаючы ад неабыякавых з нейкімі праблемамі, заканчваючы тымі, хто хоча даць інфармацыю аб наркапрытоне.

Вяртаючыся да пытання: іншыя метады — гэта сацыяльныя ролікі, білборды, інфармацыйная кампанія ў СМІ. Але мы разумеем, што метады, якія існавалі раней і нават цяпер існуюць, састарэлі, таму шукаем новыя магчымасці.

— Як вы ставіцеся да серыяла пра наркагандляроў «Ва ўсе цяжкія»?

— Не паверыце, я глядзеў гэты серыял, у мяне нават мелодыя на тэлефоне стаіць адтуль. І я лічу, што ён не пра наркотыкі, а пра чалавека, які трапіў у безвыходную жыццёвую сітуацыю. І на пэўным этапе адышоў ад агульнапрынятага пачуцця маралі. Здаецца: я круты, магу зварыць шмат кілаграмаў гэтага «лёду», мне ўсё хоць бы што. А да чаго ён прыходзіць у выніку? Сям'ю страціў, сяброў і знаёмых таксама, сам памёр. Грошы, якія ён зарабіў, страцілі сваю каштоўнасць, таму што яны аказаліся не настолькі важныя. Для мяне гэты серыял быў цікавы з псіхалагічнага, з мастацкага пункту гледжання, але тым не менш пакінуў пэўнае ўражанне — гэта шлях у нікуды.

— З якімі найбольш страшнымі падзеямі, звязанымі з наркотыкамі, давялося сутыкацца?

— Ёсць адна гісторыя. У 2014 годзе ў міліцыю паступіла паведамленне аб парушэнні грамадскага парадку: у двары дома бегалі голыя мужчыны і шумелі. На месца здарэння неадкладна выбыла следча-аператыўная група. У адным з пакояў супрацоўнікі знайшлі хлопца 1991 года нараджэння. У яго былі выдалены вочы, значна пашкоджаны вострым прадметам нос, шчака, вушы. Побач на ложку знаходзіліся два прыяцелі пацярпелага. Іх паводзіны былі адназначна ацэнены як вельмі неадэкватныя. Пазней устаноўлена, што маладыя людзі знаходзіліся ў стане, выкліканым ужываннем асабліва небяспечных псіхатропных рэчываў.

Фота БЕЛТА.

Аднак не менш шакаваў і пацярпелы: без вачэй, з парэзаным тварам, лежачы на падлозе ў лужыне крыві, ён смяяўся, спяваў песні і адказваў на ўсе пытанні міліцыянераў. Пацярпеламу была выкліканая хуткая медыцынская дапамога, якая даставіла яго ў найбліжэйшую медустанову. Жыццё пацярпелага выратавана, але зрок ён страціў назаўсёды. Трэба разумець, што ўжыванне наркотыкаў — гэта трагедыя асобнага чалавека, а таксама асобнай сям'і. Адбываюцца сапраўды страшныя рэчы, з якімі змагаюцца ўсе — і міністэрствы, і грамадскія арганізацыі. І хочацца, каб грамадзянская супольнасць яшчэ больш уключалася ў работу па прафілактыцы і супрацьдзеянні гэтай жудаснай з'яве.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.
lukashevich@zviazda.by

■

■ Гонар мундзіра

Рызыка як частка работы

Міністр унутраных спраў Ігар ШУНЕВІЧ уручыў узнагароды супрацоўнікам, якія праявілі высокае прафесійнае майстэрства. Згодна з Указам Прэзідэнта, медалём «За адзнаку ў ахове грамадскага парадку» быў узнагароджаны сяржант міліцыі Юрый СТРОК. Ён служыць вадзіцелем групы затрымання роты міліцыі Ваўкавыскага аддзела Дэпартамента аховы МУС. Дзякуючы вытрымцы і сабранасці яму ўдалося абясшкодзіць небяспечнага ўзброенага злачынцу.

Як расказаў **начальнік Гродзенскага абласнога ўпраўлення Дэпартамента аховы МУС Алег ГІШКО**, выпадак адбыўся год таму ў Ваўкавыску. Кампанія маладых людзей адпачывала на стадыёне, калі да іх падышоў незнаёмы мужчына і беспадстаўна пачаў наносіць аднаму з іх удары нунчакамі. Пацярпелы ўпаў, але потым змог падняцца і адбегчы на бяспечную адлегласць. Тым часам мужчына накіраваўся ў бок свайго дома. Пацярпелы выклікаў міліцыю, і, прасачыўшы за сваім крыўдзіцелем, удакладніў яго адрас.

Супрацоўнікі міліцыі прыбылі да дома зламыснікa, аднак на званкі ў дзверы ніхто не адказваў. Пакуль праводзілася апытанне заяўніка, каля пад'езда з'явіўся мужчына, у якім сведкі апазналі таго, хто нападаў з нунчакамі. Як высветлілася пазней, ён скарыстаўся тым, што кватэра знаходзіцца на першым паверсе, выбраўся з акна і падышоў да пад'езда, тым самым дэманструючы, нібыта да таго, што адбываецца, ён не мае ніякага дачынення.

Але празмерная доля выпітага алкаголю не дала яму і далей прытрымлівацца легенды. Зламыснік напаў на аднаго міліцыянера, нанёсшы яму ўдар нажом у левую частку грудзей. На шчасце, усе супрацоўнікі Дэпартамента аховы выязджаюць на здарэнні ў ахоўным абмундзіраванні, у прыватнасці, у бронекамізэльцы, таму прапаршчык не пацярпеў.

Тым часам зламыснік знік у пад'ездзе. Юрый Строк дагнаў яго каля кватэры, аднак нападнік здавацца не планаваў: па-ранейшаму трымаў вялікі нож напагатове і замахваўся ім. Каб абясшкодзіць атакуючага злачынцу — бо маглі таксама пацярпець людзі, якія сабраліся каля пад'езда — сяржанту давялося ўжыць табельную зброю. Нават пасля шасці раненняў у галёнкі нападнік працягваў замахвацца, а адкінуў нож толькі пасля сёмага стрэлу ў вобласць сцягна. Цяпер ён асуджаны на 11 гадоў зняволення ў калоніі ўзмоцненага рэжыму.

Сам Юрый Строк лічыць свой учынак натуральнай часткай штодзённай работы. Нягледзячы на тое, што вопыт службы ў яго не такі вялікі, дае аб сабе знаць выхаванне ў традыцыях міліцэйскай доблесці. Бацька, дзядзька і брат маладога супрацоўніка прысвяцілі сваё жыццё службе ў органах унутраных спраў, таму з дзяцінства развівалі ў Юрыя такія якасці як патрыятызм, адказнасць і мужнасць.

Дар'я КАСКО. *kasko@zviazda.by*

■

■ Супрацоўніцтва

У сесіі Генасамблеі Інтэрпола прыняла ўдзел дэлегацыя МУС Беларусі

З 26 па 30 верасня Пекін прымаў 86-ю сесію Генеральнай асамблеі Міжнароднай арганізацыі крымінальнай паліцыі — Інтэрпола. У мерапрыемстве ўдзельнічала дэлегацыя МУС Беларусі на чале з кіраўніком міліцэйскага ведамства Ігарам Шуневічам, паведамілі газеце «Звязда» ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў Міністэрства ўнутраных спраў Беларусі.

Форум сабраў больш за тысячу прадстаўнікоў праваахоўных органаў са 156 дзяржаў — членаў Інтэрпола. Дэлегаты абмеркавалі актуальныя пытанні дзейнасці арганізацыі, ключавыя аспекты міжнароднага супрацоўніцтва ў галіне процідзеяння кіберзлачынствам, тэрарызму і экстрэмізму, а таксама меры па забеспячэнні бяспекі на рэгіянальным і глабальным узроўнях. Акрамя таго, у ходзе канферэнцыі разгледжаны крытэрыі і парадак уступлення ў Інтэрпол новых краін. Зацверджаны пагадненні аб супрацоўніцтве ў барацьбе са злачынасцю і абмене інфармацыяй з шэрагам зацікаўленых арганізацый. У рамках візіту ў Кітай дэлегацыя МУС Беларусі сустрэлася з прадстаўніком Палітбюро Цэнтральнага камітэта Камуністычнай партыі КНР Мэн Цзянчжу. Як вядома, Міжнародная арганізацыя крымінальнай паліцыі — Інтэрпол — аб'ядноўвае органы паліцыі больш за 190 дзяржаў і, дзякуючы сваёй унікальнай структуры, прававой базе і тэхнічнаму аснашчэнню, здольная эфектыўна і рацыянальна каардынаваць міжнароднае супрацоўніцтва ў праваахоўнай сферы. Беларусь стала членам арганізацыі 4 кастрычніка 1993 года

■

■ За рулём

Выйграць дзесяць хвілін або прайграць усё

Чаму нават мінімальнае перавышэнне хуткасці смяротна небяспечнае?

Пункты Правілаў дарожнага руху, якія могуць ім «сыграць на руку», кіроўцы часцей за ўсё ведаюць назубок. Напрыклад тое, што адміністрацыйнае пакаранне можа наступіць толькі ў выпадку перавышэння ўстаноўленай на пэўным участку хуткасці больш чым на дзесяць кіламетраў у гадзіну. Аднак, гэта не зусім дакладна. Пры падпісанні дагавораў раяць чытаць тое, што напісана дробным шрыфтам, так і тут — па аналогіі можна парэкамендаваць вывучаць Правілы дарожнага руху (ПДР) цалкам, а не толькі тыя пункты, якія здаюцца «выгаднымі»...

Як адзначыў **намеснік начальніка арганізацыйна-аналітычнага ўпраўлення міліцыі грамадскай бяспекі МУС Вадзім ПЕТЫШ**, перавышэнне хуткасці з'яўляецца найбольш распаўсюджаным парушэннем з боку кіроўцы, што прыводзіць да аўтааварый, прычым, як правіла, якія цягнуць за сабой цяжкія наступствы.

— Калі перавышэнне хуткасці да дзесяці кіламетраў у гадзіну не караецца, то ў людзей складваецца ўражанне, што яны робяць усё абсалютна законна. Так, іх сапраўды не сфатаграфуе камера і не аштрафуе супрацоўнік ДАІ. Аднак, у выпадку здзяйснення ДТЗ, любое перавышэнне хуткасці, няхай гэта будзе нават 5 або 7 кіламетраў, што пацягнула за сабой гібель або цяжкае траўміраванне іншых удзельнікаў дарожнага руху, будзе весці ўжо не да адміністрацыйнай, а да крымінальнай адказнасці, — падкрэсліў Вадзім Петыш.

Акрамя таго ПДР абвяшчае, што пры выбары хуткасці руху кіроўца павінен улічваць не толькі абмежаванні хуткасці, але таксама інтэнсіўнасць руху, агляднасць дарогі, асаблівасці і стан транспартнага сродку і грузу, які ім перавозіцца, дарожныя, метэаралагічныя ўмовы і іншыя фактары, якія зніжаюць празрыстасць атмасферы і ўплываюць на бачнасць дарогі ў напрамку руху. Прасцей кажучы, хуткасць, якую мы бачым на знаках, — гэта тая, з якой кіроўца можа рухацца днём у яснае надвор'е. Ва ўсіх астатніх выпадках трэба арыентавацца па сітуацыі і рухацца, вядома ж, больш асцярожна. Тое ж датычыцца і пад'езду да нерэгуляванага пешаходнага перахода: кіроўца павінен рухацца з хуткасцю, якая пры неабходнасці дазволіць саступіць дарогу пешаходу. Усё гэта — выключна з меркаванняў бяспекі, прывядзём ніжэй некалькі лічбаў, каб даказаць, чаму гэта неабходна.

Пры перавышэнні ўстаноўленай хуткасці ўсяго толькі на 10% верагоднасць смяротнага зыходу ў аўтааварыі з улікам кінетычнай энергіі павялічваецца ў 1,5 раза ў адносінах да асоб, якія знаходзяцца ў машыне. На 15% — у 1,7—1,8 раза. Пры гэтым выйгрыш па часе мінімальны, менш дзесяці хвілін за гадзіну.

Яшчэ трохі статыстыкі: пры сутыкненні з машынай, якая рухалася з хуткасцю 30 км/г выжывае 90% пешаходаў, нездарма ў жылой зоне нельга рухацца з хуткасцю больш за 20 км/г. Калі казаць пра рух па трасе, то пры 130 км/г — такая хуткасць не дазволеная ў Беларусі ні на адной з аўтадарог — вугал агляду кіроўцы складае ўсяго толькі 30 градусаў, у той час як пры звыклых 90 км/г — амаль усе 180. У цэлым, усе абмежаванні хуткасці заснаваныя на экспертных разліках і навукова абгрунтаваныя.

— Два галоўныя фактары, якія ўплываюць на бяспеку на дарозе — гэта інфраструктура і культура кіравання. Што датычыцца першага пункта, то яму надаецца асаблівая ўвага. Напрыклад, на новай Гродзенскай трасе значна павялічыцца колькасць двухузроўневых развязак, а на Другой кальцавой аўтадарозе ўсе пешаходныя пераходы перанесеныя пад зямлю, а ўздоўж трасы ўсталяваныя агароджы ад дзікіх жывёл. Гэта значыць рызыкі зведзены да мінімуму — усё астатняе ў руках вадзіцеляў. Тут ужо варта гаварыць пра культуру кіравання. Не трэба, напрыклад, міргаць фарамі, маўляў, саступіце дарогу, калі чалавек едзе павольна. Неабходна з павагай ставіцца адзін да аднаго, — падвёў вынік Вадзім Петыш.

Дар'я КАСКО. *kasko@zviazda.by*

■

■ Па-за службай

НА ПЕНСІІ ЖЫЦЦЁ ТОЛЬКІ ПАЧЫНАЕЦЦА

Гэта высветліў для сябе міліцыянер у адстаўцы

Пасля чаго пачаў пісаць казкі, байкі, гумарыстычныя апавяданні. Цяпер падпалкоўнік Віталь КАРПІНСКІ больш падобны на станоўчага героя казкі ці быліны. Тры гады, як ён завяршыў кар'еру ў міліцыі, дзе апошнім часам працаваў намеснікам начальніка ўпраўлення ідэалагічнай работы і кадравага забеспячэння УУС Гомельскага аблвыканкама. Сёння ў яго зусім іншая пасада. Ён узначальвае Гусевіцкі сельскі Дом культуры, што ў Буда-Кашалёўскім раёне. І з прыкметным задавальненнем займаецца справай, якая цешыць душу.

Пра такіх кажуць: шавец, кравец, каваль, стругаль... Які пры гэтым на дудзе грае і песні спявае. І іншых заахвочвае да таго ж. Для дэманстрацыі на разнастайных святах-кірмашах зрабіў Віталь вялізную механічную цацку-атракцыён «Курачкі-нясушкі». Гаворыць, маленькія дзеці ў захапленні:

— Я кручу ручку — драўляныя курачкі танцуюць, пасля чаго выпадае яечка з імем нясушкі. Дзіця бярэ яго і кладзе ў хатку з імем курачкі. Дзверцы хаткі механічна адчыняюцца, малы засоўвае туды руку і дастае цацку.

Майстар на ўсе рукі, ён робіць шыкоўныя дэкаратыўныя пано ў тэхніцы піраграфіі і розныя прыкладныя рэчы. Іх безліч. Гэта і незвычайныя дамкі для птушак, і драўляныя цацкі, і самыя сапраўдныя ткацкія станкі. Апошнія былі дастаўлены ў Гомельскую абласную бібліятэку, дзе народны ўмелец ладзіў прэзентацыю. Тут заклалі аснову ручніка, які будуць ткаць на працягу найбліжэйшых дзён усёй грамадой. Калі што, можаце зазірнуць і сваю нітку ў тканіну прасунуць. Увогуле ж ініцыятыва «Адродзім ручнік разам» рэалізуецца ў Буда-Кашалёўскім раёне ў межах праекта «Садзейнічанне развіццю на мясцовым узроўні ў Рэспубліцы Беларусь», які фінансуецца ЕС і рэалізоўваецца па Праграме развіцця ААН (ПРААН).

Пад цэнтр ткацтва выдзелена частка памяшкання Гусевіцкага сельскага Дома культуры, дзе поўным ходам ідзе рамонт. У цэнтра будзе чатыры філіялы. Акрамя таго, тут пачне працаваць творчая майстэрня, дзе можна будзе адрэстаўраваць старыя і зрабіць новыя ткацкія станкі, а таксама сувеніры з дрэва. Напрыклад, такія, як дэманструе Віталь Карпінскі: цацкі, свістулькі, карціны... Майстар называе сябе бацькам ідэі, а маці, гаворыць — старшыня Буда-Кашалёўскага райсавета Алена Алексіна:

— У праекце «Створым ручнік разам» Алена Іванаўна адыграла вельмі значную ролю. У нас быў праект «Гісторыя маёй сям'і». Ён захапіў увесь Буда-Кашалёўскі раён. Мы з жонкай і дзецьмі тады сталі пераможцамі. Мае творчыя ідэі раённыя ўлады заўважылі, падтрымалі і дапамаглі дакументальна аформіць ініцыятыву, якая ўрэшце вырасла ў праект. Яго летась ацанілі прадстаўнікі Еўрапейскага саюза і выдалі грант у памеры 23 тысяч еўра. Шмат увагі плануем аддаваць метадычнай рабоце. Будзем збіраць і фіксаваць на фота ўсе захаваныя да нашых дзён ручнікі ў раёне. Работа гэта складаная, таму што нават у дзвюх суседніх вёсках ткалі розныя ўзоры. Там ёсць што аналізаваць і вывучаць. Сістэматызуем вынікі, а потым і за кнігу па традыцыйным ткацтве можна будзе ўзяцца.

Планы ў майстра вялікія, як і традыцыйны беларускі ручнік, даўжыня якога была чатыры метры. Сёння Віталь Карпінскі разам з калегамі саткалі пяць ручнікоў. Самым каштоўным, усміхаецца, застаецца першы, шэрага колеру:

— Такія ніткі на той час былі. Потым саткаў вясельны ручнік для старэйшага сына, які жаніўся. Увогуле ж у мяне тры сыны. Пакуль складана сказаць, якім атрымаецца наша калектыўнае палатно. Галоўнае, што яно будзе выткана з добрых думак і пажаданняў. Яны ўвасобяцца ва ўзорах, што сімвалізуюць дастатак, дабрабыт і здароўе.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.
iost@zviazda.by

■

«Вуліца Кісялёва» Валерыя ВЯДРЭНКІ.

■ Падзея месяца

ГОРАД, ЗА ВОКНАМІ ЯКОГА НЕАБСЯЖНЫЯ ТЫСЯЧЫ ТАЯМНІЦ

Паглядзець на 950-гадовы Мінск праз шкло яго пабудоў

Нягледзячы на тое, што этыкет супраць, у вячэрніх прыцемках я люблю заглядваць у вокны гарадскіх кватэр. За кожным з іх — асобны космас, створаныя людзьмі светы, свая атмасфера. Тысячы і тысячы лёсаў, якія не ахапіць, не зразумець, не ўсвядоміць. Дзе іх столькі змяшчаецца? Якія ў гэтых людзей радасці і турботы? Як яны ўладкоўваюць жыццё ў гэтай складанай сістэме горада? Мінску ў гэтым месяцы споўнілася 950 гадоў, што жыхары адзначалі і на канцэртах, і на канферэнцыях. Але з'явіўся сярод шэрагу ініцыятыў вось такі сімвалічны збор — выстава твораў мастацтва, якія паказваюць «Вокны Мінска». Арт-крытык і галерыст Ларыса Фінкельштэйн кінула «кліч», і арт-гасцёўня «Высокае места» ў Верхнім горадзе ў верасні напоўнілася жывапісам, фатаграфіяй, графікай, арт-аб'ектамі і нават вітражамі.

За агульным пералічэннем мерапрыемстваў да 950-годдзя Мінска адбылася, напрыклад, прыгожая праекцыя фотаздымкаў француза Клемана Брыена, дзе можна было пазнаць беларускую сталіцу, на будынак мінскай Ратушы. Праекцыя была часткай «Месяца фатаграфіі». У Палацы мастацтваў прайшла выстава «Стольнае места», дзе арганізатары сабралі вобраз горада са скульптуры, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, жывапісу, фатаграфіі ды іншага вядомых мастакоў і пачаткоўцаў. Сваё прысвячэнне Мінску зрабіў Белдзяржцырк, дзе прайшоў Першы Мінскі міжнародны фестываль цыркавога мастацтва з удзелам больш як ста артыстаў з сямнаццаці краін свету.

Але «Вокны Мінска», згадзіцеся, прапануюць нешта асаблівае — цёплае, утульнае і ў той жа час неабсяжнае, памятаючы, што яны заўсёды нешта хаваюць. Выстава трапляе адразу ў некалькі яблычкаў. Гэта архітэктура і знешняе аблічча горада, у якіх выяўляецца гісторыя, уплывы стыляў і сумяшчэнне іх на адной прасторы. Гэта адсылка да азначэння дома, якім становіцца для нас Мінск. Гэта сімвалічны знак асабістага, для якога месцам дзеяння зноў жа становіцца сталіца. Гэта аддзяленне гарадскога антуража — нечага знешняга — ад месца, дзе мы можам ад гэтай сістэмы адасобіцца. Гэта пачуцці і эмоцыі, якія мы адчуваем за вокнамі горада. Акно — даволі просты вобраз, які прыгожа намякае, што ён толькі першая прыступка да вялікай таямніцы. А гэтых таямніц у Мінску, ды яшчэ за 950 гадоў, — процьма.

З той нагоды, што выстава «Вокны Мінска» аб'ядноўвае ў сабе высокае мастацтва, адсылку да ўтульных момантаў жыцця, неахопны пласт таямніц і з гэтага спараджае прыемнае раздражненне ўнутры, яна і становіцца сапраўднай падзеяй месяца. І месца для падзеі, прысвечанай юбілею Мінска, — таксама прыдатнае, бо дзе яшчэ аддаваць даніну сталіцы ў гонар яе нараджэння, як не ў Верхнім горадзе?

Акно — даволі просты вобраз, які прыгожа намякае, што ён толькі першая прыступка да вялікай таямніцы. А гэтых таямніц у Мінску, ды яшчэ за 950 гадоў, — процьма.

«У мяне ўстойлівае адчуванне, што краявіды — вясковыя, гарадскія, эпічныя, лірычныя — становяцца асаблівымі, калі глядзіш на іх праз раму ці акенца, — кажа куратарка выставы Ларыса Фінкельштэйн. — У студэнцкія гады не ўсе мелі сваё жыллё, а будавалася шмат будынкаў, яны запаўняліся, у іх жылі людзі, у вокнах гарэла святло. А студэнты думалі: «Дзе ж згубілася акенца, прызначанае для мяне?» Ад вобраза акна ўзнікала нешта асабістае, бо гэта мяжа паміж памяшканнем і вялікім светам, мікрасветам аўтара і макрасветам, вялікім космасам. Чалавек, бывае, раптам адыходзіць да акна і кудысьці глядзіць, быццам у сваіх думках выходзіць з гэтага памяшкання. Ён не адразу вам адкажа і нават не адразу зразумее, што вы ад яго хочаце, бо знаходзіцца ў іншым свеце, бо акно — гэта нешта асабістае. Для арганізацыі выставы можна было пайсці простым шляхам і звярнуцца да сучасных мастакоў, якія прынеслі б у галерэю па некалькі сваіх работ. Але мне гэта нецікава, мне трэба было, каб акно прысутнічала ва ўсіх відах мастацтва, каб яно было ўвасоблена рознымі мастакамі. Якім Мінск бачыцца праз акно? Якое яно, гэтае акно? Хто ў яго глядзіць?..»

Ідэя Ларысы Фінкельштэйн прыцягнула ў выставачную прастору «Высокае места» калекцыянераў і ўласна мастакоў, а ў выніку паказала ў галерэі каля ста дваццаці работ прыкладна шасцідзесяці аўтараў. Свой унёсак зрабілі мінскія калекцыянеры Андрэй Плясанаў, Яўген Ксяневіч, Юрый Бокач, Ігар Бархаткоў, Міхаіл Шэйко, Максім Дорахаў і іншыя, дзякуючы каму «ў свет» выйшлі работы Гаўрыіла Вашчанкі, Генадзя Хацкевіча, Оскара Марыкса... У залах галерэі — Зоя Літвінава, Сяргей Балянок, Рыгор Іваноў, некалькі работ прынёс Адам Глобус, і іх уключылі ў экспазіцыю без аніякай селекцыі. Некаторыя работы ствараліся спецыяльна для выставы, гэтую частку запоўнілі выпускнікі і студэнты Акадэміі мастацтваў.

З той нагоды, што выстава «Вокны Мінска» аб'ядноўвае ў сабе высокае мастацтва, адсылку да ўтульных момантаў жыцця, неахопны пласт таямніц і з гэтага спараджае прыемнае раздражненне ўнутры, яна і становіцца сапраўднай падзеяй месяца.

Выставе «Вокны Мінска» засталося працаваць некалькі дзён, на жаль, дзень нараджэння здараецца толькі раз у год. Адзінае што, горад глядзіць на нас усё тымі ж вокнамі, старыя гісторыі за імі атрымліваюць нечаканыя сюжэтныя павароты, а новыя пачынаюць свой летапіс, у сталіцы ўсё тая ж безліч таямніц. 951-ы год.

Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.
katsyalovich@zviazda.by

■ Свята

У Мінску стартаваў тэатральны форум «ТЭАРТ»

«ЖАНІЦЬБАЙ» СКОНЧЫЛІ — З «ЖАНІЦЬБЫ» ПАЧАЛІ

Восем замежных і адзінаццаць беларускіх пастановак: 27 верасня ў Мінску адкрыўся штогадовы, гэтым разам сёмы, міжнародны форум тэатральнага мастацтва «ТЭАРТ» і адразу адправіў нас з месца ў кар'ер. Распачаўся ён з манернага, драйвовага, смешнага — бліскучага спектакля латвійскага Ліепайскага тэатра «Жаніцьба» па Гогалю, працягнуў французскім балетам Анжэлена Прэльжакажа «Фрэска. Карціна на сцяне», паабяцаў сёння паказаць пастаноўку ўжо вядомага ў Мінску рэжысёра Цімафея Кулябіна «Іванаў».

І яшчэ на некалькі тыдняў, аж да 16 кастрычніка, працягнуць гэты тэатральны «сезон». Мінулы форум «ТЭАРТ» завяршыўся таксама «Жаніцьбай» — пэўным амажам Санкт-Пецярбургу «Горад. Жаніцьба. Гогаль» у пастаноўцы Юрыя Бутусава. А гэта нагадвае нам, што форум — не рандомная, а сістэмная з'ява, якая, дарэчы, ці не ў першую чаргу накіравана на ўласна тэатр беларускіх абшараў. Мяркуецца, што адзінаццаць пастановак у традыцыйнай праграме «Belarus open» здольны нейкім чынам адлюстраваць, на якім этапе развіцця ў адпаведнай галіне сёння знаходзіцца наша краіна. Дарэчы, беларускі тэатр, які ці то з'яўляецца часткай еўрапейскай культуры, ці то знаходзіцца па-за яе межамі, абмеркавалі ў прасторы Ок16 на традыцыйнай дыскусіі напярэдадні адкрыцця «ТЭАРТа».

Уздыхаў пра адраджэнне ці ўздым чуваць не было, усё неяк больш пра знаходжанне ў рэзервацыі. Але ўласна мяне зачапіла, што стваральнікі «ТЭАРТа» (увогуле на дыскусіі былі прадстаўнікі тэатральных устаноў, рэжысёры, крытыкі) глядзяць на свой фестываль праз прызму ўздзеяння на сітуацыю ў краіне. Яны заклапочаны тым, каб выхоўваць публіку, паказваць тэатральным дзеячам замежныя поспехі, стымуляваць развіццё новых формаў і з'яўленне эксперыментаў. Старшыня праўлення «Белгазпрамбанка», што з'яўляецца генеральным партнёрам «ТЭАРТа», Віктар Бабарыка задаецца пытаннем, ці правільным шляхам ён ідзе, спансіруючы тэатральны форум. Можа, было б больш карысна арганізаваць для дзесяці перспектыўных беларускіх тэатральных дзеячаў трып, у якім яны змаглі б шчыльна пазнаёміцца з набыткамі сусветнай тэатральнай культуры?

Доўгая чарга, што выстраілася перад Цэнтральным домам афіцэраў, дзе планавалася «Жаніцьба», паказвае на тое, што ў замежных выказваннях у нас зацікаўлена больш за дзесяць чалавек. «ТЭАРТ», відавочна, стаў модным мерапрыемствам і з усіх бакоў пазітыўным. Манеры Віктара Бабарыкі, які пад'язджае да Дома афіцэраў на люксавым аўто і сціпла становіцца ў канец чаргі, лішні раз звязваюць форум з культурай менавіта еўрапейскай, часткай якой хаця б геаграфічна мы безумоўна з'яўляемся.

Але ці толькі геаграфічна? «На жаль, мы ў рэзервацыі, гэты факт трэба прызнаць. Беларусі няма на тэатральнай карце, і нам трэба зразумець, што мы можам зрабіць, калі не з'яўляемся часткай дзяржаўнага апарату, таму што прамоцыя і прасоўванне краіны — гэта задача дзяржавы, — каментуе тэатральны крытык Таццяна Арцімовіч. — Цудоўна, што, напрыклад, Рускі тэатр у 2017 годзе пачаў карыстацца паняццямі «менеджмент» і «рэбрэндынг», а ў яго афішы з'явіўся Дзмітрый Багаслаўскі, але гэта павінна было здарыцца дзесяць гадоў таму. А што трэба сёння, каб адбылася сінхранізацыя з глабальнай картай?»

Кіраўнік Цэнтра беларускай драматургіі Аляксандр Марчанка ў адказ звязвае канстатацыю «мы ў рэзервацыі і гэты факт трэба прыняць» з выразам «толькі асобы ў тэатры нешта мяняюць»: «Я ўпэўнены, што толькі прыняцце як першы крок здольна штурхнуць нас уперад. Можна, і для тэатра важна, нагледзецца на форму, але нагледзецца на змест ужо больш складана. Тут узнікае пытанне з асобай і з тым, ці ўпісаны беларускі тэатр у еўрапейскі кантэкст. Мне падаецца, што ў рэзервацыі мы знаходзімся якраз у адносінах да свабоды ўласнай свядомасці. То-бок пра што тэатр кажа?..

Пакуль вядуцца дыскусіі, карысныя, напэўна, толькі канстатацыямі, робіцца справа: ідзе модны ў Мінску тэатральны форум, які паказвае найлепшыя беларускія і выбітныя замежныя пастаноўкі. За гэты час публіка, якая звычайна аддае перавагу таму, што прасцей і весялей, бачыць, што тэатральныя абсягі куды глыбейшыя і разнастайнейшыя. Крытыка рэагуе на «чужое» абмеркаваннем і аналізам. Тэатральнае поле напаўняецца новымі інфармацыяй і эмоцыямі. Усе гэтыя рухі, магчыма, здольны паўплываць на энергію беларускага тэатра ў цэлым. У тым, што залежыць ад асобы. Бо дырэктар РТБД Уладзімір Карачэўскі на той жа дыскусіі запэўніў, што залежнае ад дзяржавы развіццю тэатра ніяк не перашкаджае.

Ірэна КАЦЯЛОВІЧ. *katsyalovich@zviazda.by*

■ Прэм'ера

СКРЫНЯ З АВАРЫЙНЫМ ВЫХАДАМ,

або Куды спускаюцца Арфеі?

Мая клетка на пятым паверсе. У ёй ёсць усе выгоды, але цяпло яшчэ не бяжыць па батарэях — мы прывыклі, што яго ўключаюць па графіку. Цяпло не па графіку (у любым варыянце) раўназначнае жыццю ў раі.

Таму свет, які складаецца з бетонных шматпавярховых каменных скрынак, здаецца безнадзейна шэрым. Халодным. У аднастайнай беспрасветнасці, мітусні, зададзенасці людзі выглядаюць безабароннымі ценямі, восьвось маналітны жудасны бетон прыцісне — не ўратуецца нават цень... Але ў адной з клетак запальваецца святло: бетон пачынае дыхаць. У ім б'ецца пульс, у шэрай скрыні можа нават расквітнець сад. Бетон зачаравальны. А мы і не ўяўлялі...

Организатор электронных торгов: Михановичский сельский исполнительный комитет, Минская обл., Минский район, аг. Михановичи, пер. Садовый, 8, тел.: (017) 545 10 25, 503 71 00, 545 10 23, тел. моб.: 8 (029) 165 98 22 (VEL), 8 (029) 559 28 62 (МТС).

Оператор электронной торговой площадки: открытое акционерное общество «Белорусская универсальная товарная биржа».

Электронный адрес электронной торговой площадки: www.et.butb.by

Дата проведения электронных торгов: 17 октября 2017 года.

Время проведения электронных торгов устанавливается ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа» на электронной торговой площадке «БУТБ-Имущество»

№ п/п	Адрес земельного участка	Кадастровый номер	Площадь земельного участка, *га*	Инженерная инфраструктура	Начальная цена земельного участка, *(руб.)*	Сумма задатка, *(руб.)*	Расходы по подготовке, *(руб.)*
1	д. Гребенка, объект **№ 130**, Михановичский с/с, Минский район	623684201601000072	0,1457	Подъездные пути, электричество*	5320,00	532,00	1743,91 + расходы на размещение информации в СМИ и на ЭТП
2	д. Гребенка, объект **№ 131**, Михановичский с/с, Минский район	623684201601000071	0,1453	Подъездные пути, электричество*	5305,00	530,50	1793,16 + расходы на размещение информации в СМИ и на ЭТП
3	д. Кайково,объект **№ 42-2015/Мих**, Михановичский с/с, Минский район	623684202601000303	0,1202	Подъездные пути, электричество, газ. Центральное водоснабжение*	15000,00	1500,00	1630,45 + расходы на размещение информации в СМИ и на ЭТП
4	д. Михановичи, объект **№ 46-2015/ Мих,** Михановичский с/с, Минский район	623684204101000188	0,1500	Подъездные пути, газ, электричество	8975,00	897,50	1639,57 + расходы на размещение информации в СМИ и на ЭТП
5	д. Михановичи, участок **№ 1**, Михановичский с/с, Минский район	623684204101000215	0,0976	Подъездные пути местного значения. Свет, газ в ближайшей перспективе*	6097,00	609,70	1934,00 + расходы на размещение информации в СМИ и на ЭТП
6	д. Михановичи, участок **№ 2**, Михановичский с/с, Минский район	623684204101000214	0,0924	Подъездные пути местного значения. Свет, газ в ближайшей перспективе*	5772,00	577,20	1934,00 + расходы на размещение информации в СМИ и на ЭТП
7	д. Михановичи, участок **№ 3**, Михановичский с/с, Минский район	623684204101000216	0,0906	Подъездные пути местного значения. Свет, газ в ближайшей перспективе*	5580,67	558,07	1992,92 + расходы на размещение информации в СМИ и на ЭТП
8	д. Михановичи, участок **№ 4**, Михановичский с/с, Минский район	623684204101000220	0,0906	Подъездные пути местного значения. Свет, газ в ближайшей перспективе*	5580,67	558,07	1992,92 + расходы на размещение информации в СМИ и на ЭТП
9	д. Михановичи, участок **№ 5**, Михановичский с/с, Минский район	623684204101000217	0,0924	Подъездные пути местного значения. Свет, газ в ближайшей перспективе*	5772,00	577,20	1934,00 + расходы на размещение информации в СМИ и на ЭТП
10	д. Михановичи, участок **№ 6**, Михановичский с/с, Минский район	623684204101000218	0,0936	Подъездные пути местного значения. Свет, газ в ближайшей перспективе*	5847,00	584,70	1934,00 + расходы на размещение информации в СМИ и на ЭТП
11	д. Михановичи, участок **№ 10**, Михановичский с/с, Минский район	623684204101000223	0,1110	Подъездные пути местного значения. Свет, газ в ближайшей перспективе*	6934,00	693,40	1934,00 + расходы на размещение информации в СМИ и на ЭТП
12	д. Михановичи, участок **№ 11**, Михановичский с/с, Минский район	623684204101000224	0,1005	Подъездные пути местного значения. Свет, газ в ближайшей перспективе*	6278,00	627,80	1992,92 + расходы на размещение информации в СМИ и на ЭТП
13	д. Михановичи, участок **№ 12**, Михановичский с/с, Минский район	623684204101000225	0,1245	Подъездные пути местного значения. Свет, газ в ближайшей перспективе*	7777,17	777,72	2054,33 + расходы на размещение информации в СМИ и на ЭТП

** в разделе «инженерная инфраструктура» указаны коммуникации, которые имеются в данном населенном пункте. Подключение к указанным коммуникациям возможно только в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выдаваемыми эксплуатирующими и согласующими организациями.*

Задаток для участия в электронных торгах перечисляется на текущий (расчетный) счет № BY60AKBB30120000066940000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код AKBBBY2X, УНП 190542056, получатель платежа – ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа». **Срок внесения задатка** – до подачи заявления на участие в электронных торгах. **Назначение платежа:** внесение суммы задатка на участие в торгах. **Окончание приема заявлений на участие в электронных торгах** с прилагаемыми к ним документами – **11 октября 2017 года, 15.00.**

Лицо, желающее принять участие в электронных торгах в отношении нескольких предметов электронных торгов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из этих предметов. Оплата стоимости предметов торгов осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. Осмотр земельных участков на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

Электронные торги проводятся в порядке, установленном Положением о порядке проведения электронных торгов по продаже государственного имущества, включая земельные участки, права заключения договора аренды государственного имущества, в том числе земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 №608 и Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа» от 29.12.2015 №143.

В течение десяти рабочих дней после утверждения протокола победитель электронных торгов (претендент на покупку) обязан:

возместить затраты на организацию и проведение электронных торгов;

возместить расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении этого земельного участка;

выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка;

внести плату (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения) за земельный участок, продаваемый в частную собственность, или за право заключения договора аренды земельного участка.

После совершения победителем электронных торгов (претендентом на покупку) указанных действий, но не позднее двух рабочих дней, местный исполнительный комитет передает ему выписку из решения об изъятии земельного участка и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона и один экземпляр протокола, а также заключает с ним договор аренды земельного участка – в случае проведения электронных торгов по продаже права заключения договоров аренды земельных участков.

■ Ноу-хау

ЗАШМАТ «НАВАРОТАЎ»

Новыя тэхналогіі ў галіне аўтамабілебудавання аказаліся для амерыканцаў занадта складанымі

Аўтавытворцы рэгулярна рапартуюць пра ўкараненне ў новыя мадэлі аўто ўльтрасучасных тэхналогій і дзіўных функцый, але вось парадокс: амерыканскае агенцтва J.D. Power падрыхтавала цікавую справаздачу, паводле якой усе гэтыя «навароты» пакупнікам не надта і патрэбныя. Як жа так?

У даследаванні пад назвай «2017 Tech Experience Index» (індэкс тэхнічнага досведу) прыняло ўдзел больш за 19 500 уладальнікаў аўтамабіляў у ЗША. Вынікі заснаваны на адказах 14 900 чалавек, якія набылі ва ўласнасць або выкарыстоўваюць у лізінгу/арэндзе аўтамабілі 2017 года выпуску — абсалютна новыя мадэлі або якія выйшлі на рынак не больш за тры гады таму. Перыяд валодання транспартным сродкам у кожным выпадку складаў не менш за 90 дзён.

Высветлілася, што ўладальнікі як бюджэтных мадэляў, так і дарагіх аўтамабіляў прэміум-класа ў роўнай ступені задаволеныя ўзроўнем тэхналогій і прастатой іх выкарыстання ў сваёй машыне, паколькі большасць кіроўцаў проста не разумеюць, як яны працуюць, і таму не выкарыстоўваюць усе даступныя ім функцыі. Агульная задаволенасць тэхналогіямі ў новых аўтамабілях сярод і адных, і другіх складае ў сярэднім 75%. Задаволенасць тэхналогіямі найбольш высокая ў вялікім сегменце (77,7%), за якім ідуць кампактны сегмент (75,3%), кампактны прэміяльны сегмент (75,1%), сярэднепамерны прэміяльны сегмент (74,6%), сярэднепамерны сегмент (74,4%), малы прэміяльны сегмент (73,9%) і «проста» малы сегмент (73,2%). Важнымі фактарамі для вызначэння карыстальніцкага досведу ўладальнікі аўтамабіляў назвалі прастату інтэрфейсу, зручнасць і карыснасць.

Хоць спачатку кіроўцы, як правіла, у захапленні ад новых тэхналогій і функцый аўтамабіля, пры іх практычным прымяненні з'яўляецца шмат праблем. Як паказвае вопыт, у гэтым выпадку для карыстальнікаў не мае значэння прычына — ці зробяць яны нешта няправільна, ці адбываецца рэальны збой. Але самая важная (і, дарэчы, вельмі простая) прычына, па якой уладальнікі не выкарыстоўваюць тыя ці іншыя функцыі свайго аўтамабіля, гэта нават не залішняя складанасць, а тое, што яны папросту ім непатрэбныя. Самай бескарыснай функцыяй кіроўцы назвалі ўбудаваны ў аўтамабіль роўтар Wi-Fi — ім карыстаюцца толькі 10% кіроўцаў. 43% кажуць, што не маюць патрэбы ў гэтым, а 24% адзначылі, што паспрабавалі, але гэта аказалася занадта складана. А вось сярод самых карысных тэхналогій уладальнікі аднадушна называюць сістэму папярэджання сутыкненняў: ёй задаволеныя 78,7% апытаных. Спадарожнікавая навігацыя падабаецца 71,4% вадзіцеляў, сістэму кантролю слепых зон назвалі карыснай 86,1%, а сістэму кругавога агляду — 85,6%.

Прычынай цяжкасцяў у выкарыстанні ўльтрасучасных тэхналогій вадзіцелі называюць недахоп увагі, якую персанал дылераў удзяляе пакупнікам пры продажы аўтамабіля. На іх думку, прадавец павінен старанна ўсё растлумачыць, расказаць аб усіх функцыях і прадэманстраваць, як імі карыстацца. Ну, ці ўсе гэтыя тэхналогіі павінны быць інтуітыўна зразумелыя ў выкарыстанні — але, мяркуючы па выніках даследавання, пакуль гэта зусім не так.

Што цікава, уладальнікі аўтамабіляў праводзяць паралелі паміж прастатой работы існуючых у аўтамабілі тэхналогій і даверам да іх. Калі кіроўца не можа зразумець, як правільна наладзіць, напрыклад, адаптыўны круіз-кантроль у сваім аўтамабілі, то ён цалкам абгрунтавана сумняваецца і ў яго здольнасці кіраваць транспартным сродкам. Як можна даверыць сваё (і не толькі) жыццё машыне, калі ты нават не можаш разабрацца ў яе функцыях?

На вуліцы Каліфорніі выпусцяць 20 млн камароў

Камары пераносяць вірусы — такія, як вірус ліхаманкі Заходняга Ніла ці Зіка. Для таго каб паменшыць колькасць гэтых насякомых, навукоўцы выпусцяць на вуліцу мільёны новых. Супярэчнасці ў гэтым няма: лабараторныя камары павінны знішчыць сваіх звычайных сабратаў.



У каліфарнійскім горадзе Фрэсна на працягу 20 тыдняў будзе праводзіцца эксперымент: кожныя сем дзён навукоўцы будуць выпускаць на волю па мільёне камароў Aedes aegypti. Праект пад назвай Debug Fresno рэалізуецца кампаніяй Verily Life Sciences пры падтрымцы шэрагу навукоўцаў. Лабараторныя даследаванні вяліся з канца мінулага года, а зараз прыйшоў час для першага палявога выпрабавання. Усе 20 мільёнаў камароў — самцы, заражаныя бактэрыяй вальбахія. Адно з яе дзеянняў — так званая дэгенерацыя эмбрыёнаў, гэта значыць немагчымасць заражанага арганізма нарадзіць жыццяздольных нашчадкаў. Паколькі ў прыродзе людзей кусаюць толькі самкі камароў — павелічэнне колькасці насякомых за кошт самцоў на жыхарах горада не адаб'ецца. Затое, паводле прагнозаў навукоўцаў, самкі больш не змогуць адкладаць жывыя яйкі, і ў перспектыве папуляцыя камароў значна паменшыцца.

Яны недзе побач?

Адстаўны інжынер ВПС ЗША напісаў кнігу пра сакрэтную турму прышэльцаў

Інжынер ВПС ЗША Рэйманд Жыманскі, які выйшаў у адстаўку пасля 39 гадоў службы, напісаў кнігу «50 адценняў шэрых», у якой расказвае аб сакрэтнай турме для іншапланецян, нібыта размешчанай у падземных тунэлях авіяцыйнай базы Райт-Патэрсан у штаце Агаё. Пра гэта паведамляе брытанскае выданне The Sun.

Паводле слоў Жыманскі, ён даведаўся тайну ў першы тыдзень службы ад свайго настаўніка, якога называе Эл. Той нібыта расказаў, што пасля крушэння лятаючай талеркі ў штаце Нью-Мексіка, вядомага як Розуэльскі інцыдэнт, машына і яе насельнікі былі дастаўлены менавіта на гэтую базу. На працягу наступных дзесяцігоддзяў Жыманскі неаднаразова ўдзельнічаў у размовах, якія пацвярджаюць словы Эла. «І ніхто ні разу не сказаў — «Ты дурнаваты, у нас няма ніякіх іншапланецян!» Многія ўхмыляліся, але ніхто не аспрэчваў», — падкрэсліў аўтар кнігі. Жыманскі дадаў, што асабіста ён не бачыў ні падзямелляў, ні прышэльцаў, але некалькі разоў сустракаў на базе персанажаў, падобных на герояў галівудскага фантастычнага фільма «Людзі ў чорным», апранутых у цёмныя касцюмы і капелюшы нават у гарачыя летнія дні. На яго думку, гэта былі супрацоўнікі ўрадавай спецслужбы, занятыя ўтойваннем доказаў.

Шэрымі (у рускай мове таксама выкарыстоўваецца варыянт «грэі», ад англійскага grey — «шэры») ва ўфалогіі называюць адну з іншапланетных рас. Іх апісваюць як чалавекападобных істот без відавочных палавых прыкмет, з гладкай шэрай скурай, непрапарцыйна буйной галавой і вялікімі чорнымі вачыма. Звесткі аб іх характары і паходжанні розняцца.

Розуэльскі інцыдэнт — выбух лятаючага аб'екта ў небе над горадам Розуэл (штат Нью-Мексіка), які адбыўся ў чэрвені 1947 года. Паводле афіцыйнай версіі, гэта быў метэазонд, канспіролагі лічаць, што гаворка ішла пра крушэнне НЛА. У 1995 годзе быў апублікаваны відэаролік «Анатаміраванне прышэльца», нібыта зняты на сакрэтнай базе. Спецыялісты высветлілі, што запіс зроблены на апаратуры 60-х гадоў, а патолагаанатамы знайшлі мноства парушэнняў у дзеяннях людзей у кадры, аднак прадзюсар Рэй Санцілі, які апублікаваў яго, сцвярджае, што гэта не падробка, а прайгранне арыгінальнай стужкі, страчанай з-за спякоты і вільгаці.

Кадр з відэароліка «Анатаміраванне прышэльца».

■ Дайджэст

РЭАЛІСТЫЧНЫЯ РОБАТЫ АТРЫМАЮЦЬ МЯККІЯ ЦЯГЛІЦЫ

Група даследчыкаў са Школы інжынерыі і прыкладных навук Калумбійскага ўніверсітэта распрацавала новы тып сінтэтычных мяккіх цягліц, вырабляць якія можна з дапамогай тэхналогіі 3D-друку. Матэрыял атрымаўся вельмі трывалы і здольны вытрымліваць вагу, якая ў 1000 разоў пераўзыходзіць яго ўласную, а мяжа яго энергіі пругкай дэфармацыі (расцяжэння) у 15 разоў вышэйшая ў параўнанні з тканінамі сапраўдных цягліц.

Матэрыял не патрабуе выкарыстання вонкавай крыніцы для кіравання ціскам, што часта сустракаецца ў іншых існуючых рашэннях, якія абапіраюцца на энергію пнеўматычнай або гідраўлічнай інфляцыі (надзімання). Гэтыя кампаненты, як правіла, займаюць шмат месца, што робіць іх нязручнымі ў выкарыстанні пры стварэнні машын. Асновай сінтэтычных цягліц служыць сіліконавы каўчук, які мае кіпрую структуру з запаўненнем этанолам. Матэрыял прыводзіцца ў работу з дапамогай электрычнага току малой магутнасці.

Новыя сінтэтычныя цягліцы могуць прынесці вялікую карысць у сферы распрацоўкі і вытворчасці так званых мяккіх ці рэалістычных робатаў (вельмі падобных на людзей ці іншых жывых істот). За апошнія гады назіраецца велізарны прагрэс у стварэнні машын, надзеленых магчымасцю выконваць мноства тонкіх пастаўленых задач, але застаецца яшчэ мноства дзеянняў, выконваць якія цвёрдыя робаты не могуць. Дзеянні, звязаныя з захопам аб'ектаў і маніпуляцыяй імі, патрабуюць наяўнасці пэўнага ўзроўню спруты і гнуткасці, забяспечыць які цяперашнія тэхналогіі не ў стане. Новыя ж матэрыялы дазволяць ствараць робатаў, здольных маніпуляваць мяккімі і маленькімі аб'ектамі, не наносячы ім пашкоджанняў. Машыны, якія выкарыстоўваюць падобныя тэхналогіі, змогуць забяспечваць надзейную дапамогу чалавеку ў працы ў сітуацыях, дзе патрабуюцца далікатныя дзеянні, напрыклад, у медыцыне. Таксама магчыма выкарыстанне падобных матэрыялаў у пратэзах новага пакалення.

Сінтэтычная цягліца перад і пасля прывядзення ў дзеянне.

ДРОНЫ ПАСТУПІЛІ НА СЛУЖБУ Ў ПАЛІЦЫЮ

Дроны, якія лётаюць, могуць стаць добрай падтрымкай для паліцыі і іншых службаў. З паветра можна лёгка высачыць злачынцу, зрабіць здымкі месца злачынства або зняць на відэа пэўную мясцовасць. Менавіта таму паліцыя Вялікабрытаніі вырашыла пашырыць свае магчымасці з дапамогай спецыяльнага падраздзялення, у якое ўваходзяць вопытныя аператары.

Для гэтага некалькі камандаў афіцэраў прайшлі спецыяльную падрыхтоўку і пасля 18 месяцаў трэніровак прыступілі да работы. Цяпер у распараджэнні супрацоўнікаў паліцыі маюцца ўніверсальныя дроны DJI Inspire, абсталяваныя цеплавізарам і камерамі высокай якасці, — гэта абсталяванне дазваляе выкарыстоўваць квадракоптары для розных задач, таму з іх дапамогай ужо здымаюць месцы злачынстваў, ДТЗ і маніторацъ ахоўныя зоны, дапамагаючы змагацца з экалагічнымі правапарушэннямі. Цяпер жыхары Дэвона, Корнуэла і Дорсета добра падумаюць перад тым, як пайсці ў прыгарадныя лесапалосы, каб пасмажыць на вогнішчы мяса — дроны выдатна спраўляюцца з задачай аэрафотаздымкі, таму парушальнікаў стала значна прасцей выяўляць. Дроны змогуць дапамагчы і ў іншых, значна больш складаных аперацыях, але і ў іх ёсць недахопы. Напрыклад, яны не змогуць выканаць ускладзеныя на іх задачы пры моцным ветры, дажджы ці снегападзе.

Матэрыялы падрыхтаваў Іван КУПАРВАС. *hvir@zviazda.by*

БАРСЕЛОНА VS МАДРЫД

Ці здолее Каталонія дабіцца незалежнасці?

Каталонія апошнім часам зноў у «топе» стужак навін сусветных інфармагенцтваў. На 1 кастрычніка тут прызначаны рэферэндум аб незалежнасці ад Іспаніі. Плебісцыт, запэўніваюць мясцовыя палітыкі, адбудзецца нягледзячы на ўсе пагрозы Мадрыда. Урад краіны, у сваю чаргу, катэгарычна супраць і пагражае сепаратыстам самымі жорсткімі мерамі. Як сцвярджаюць аналітыкі, Іспанія цяпер на парозе глыбокага палітычнага крызісу, якога не бачыла з заканчэння грамадзянскай вайны ў 1936 годзе. Чым гэтым разам абернецца палітычнае супрацьстаянне Мадрыда і Барселоны?

Сярпом па кароне

Карані канфлікту «памерам» амаль з тысячагоддзе. Каралеўства Арагон, якое размяшчалася прыкладна на той жа тэрыторыі, што і сённяшняя Каталонія, з'явілася ў XI стагоддзі — тады ж, калі і каралеўства Кастылія, з якога паўстала сучасная Іспанія. У 1516 годзе кароль Арагона і каралева Кастыліі пабраліся шлюбам і аб'ядналі свае землі, якія, аднак, фармальна заставаліся рознымі дзяржавамі, хоць і з адной кіруючай дынастыяй. Іспанская мова паступова пачала адцясняць каталонскую, а з часам справа дайшла да таго, што іспанскія каралі задумаліся аб адмене каталонскай аўтаноміі (якая надавала рэгіёну пэўныя прывілеі). У 1640 годзе гэта прывяло да паўстання, вядомага як Вайна жняцоў — у ім прымалі актыўны ўдзел сяляне, якія выкарыстоўвалі сярпы ў якасці зброі. Каталонская знаць абвясціла аб незалежнасці ад іспанскай кароны і абвясціла рэспубліку. Іспанцы мяцеж задушылі, а ў пачатку XVIII стагоддзя канчаткова ліквідавалі аўтаномію правінцыі. Вайна жняцоў стала першай спробай нацыянальнага самавызначэння каталонцаў, а «Песня жняцоў», якая з'явілася ў тыя гады, дасюль з'яўляецца гімнам Каталоніі.

У XIX стагоддзі Каталонія стала прамысловым сэрцам Іспаніі, і ў каталонскай інтэлігенцыі і палітыкаў усё часцей сталі ўзнікаць думкі: а ці так ужо патрэбна Іспанія каталонскаму народу? Да канца XIX стагоддзя ўспаміны пра кароткую, але страчаную незалежнасць правінцыі сталі папулярнай тэмай для абмеркавання і ў публіцыстыцы. Зорны час каталонскай незалежнасці прыпаў на перыяд Другой рэспублікі, якая была абвешчана ў краіне ў 1931 годзе пасля падзення манархіі. Да таго часу ў рэгіёне ўжо існаваў моцны сепаратысцкі рух, дзякуючы якому ў 1932-м ён атрымаў аўтаномны статус, быў сфарміраваны рэгіянальны ўрад — жэнералітат *(урад)*. Каталонія стала адной з галоўных апор маладой рэспублікі.

Новая песня

Адказам на перамогу левых стаў правы мяцеж Франка. У краіне пачалася грамадзянская вайна, у якой паўсталага генерала падтрымалі Германія і Італія, а рэспубліцы аказаў падтрымку Савецкі Саюз. Каталонія аказвала асабліва моцны супраціў франкістам і пала пад ударамі мяцежнікаў адной з апошніх. Упартасць каталонцаў тлумачылася двума фактарамі: па-першае, Франка лічыў, што каталонская мова не мае права на існаванне, а аўтаномія павінна быць ліквідаваная. Па-другое, прамысловая Каталонія была пралетарскім рэгіёнам — тут налічвалася велізарная колькасць левых аб'яднанняў, варожых ваеннай дыктатуры Франка. Менавіта ў каталонскім анархісцкім апалчэнні ваяваў англійскі рэспубліканскі добраахвотнік — пісьменнік Джордж Оруэл.

Але рэспубліка змагла пратрымацца толькі тры гады. У 1939-м Франка атрымаў перамогу. Пачалося масавае знішчэнне палітычных праціўнікаў рэжыму. Новыя ўлады ліквідавалі аўтаномію, актывісты беглі з краіны або былі арыштаваныя, прычым арышт нават здаваўся дабром, таму што ў першыя гады забойствы без суда і следства былі звычайнай практыкай. У 1940-я гады краіна была царствам тэрору, але пазней рэжым Франка некалькі памякчэў. Іспаніі патрабаваліся добрыя адносіны з НАТА і еўрапейскімі суседзямі, а таксама эканамічны рост.

Але ў культурных адносінах каталонцы жыць лягчэй не сталі. Каталонскія культура і мова знаходзіліся пад строгай забаронай. Размовы на каталонскай мове не дапускаліся не толькі ў публічных месцах, але і ў побыце: за гэта пагражаў штраф, а ў асобных выпадках — нават турэмнае зняволенне. Любыя праявы каталонскага нацыяналізму строга душыліся, забараняліся нават надмагіллі на каталонскай. Сітуацыя трохі змянілася толькі ў другой палове 1960-х гадоў, калі каталонскую мову пачалі абмежавана выкарыстоўваць у некаторых рэгіянальных СМІ. У 1968 годзе на конкурсе «Еўрабачання» Іспанію прадстаўляў спявак з Каталоніі Жуан Мануэль Серат. Ён адмовіўся спяваць на іспанскай мове, і ўлады ледзь паспелі замяніць выканаўцу, каб ён не выступіў на галоўнай музычнай еўрапейскай пляцоўцы на каталонскай (пазней Серат быў выгнаны з краіны). Сярод музыкаў развіўся цэлы рух «Новая песня» (Nova Canco), прыхільнікі якога спявалі толькі на каталонскай мове. А песня Люіса Льяка «Слуп» стала гімнам пратэстных рухаў у розных краінах свету.

Шампанскае скончылася

Састарэлы дыктатар Франка памёр у 1975-м, яго кіраванне працягвалася амаль 40 гадоў. Пасля яго смерці пачаўся працэс дэмантажу дыктатуры. Расстацца з мінулым асабліва імкнуліся ў Каталоніі — існуе нават легенда, што ў дзень смерці Франка ў крамах Барселоны раскупілі ўсё шампанскае. У 1978-м новая Канстытуцыя Іспаніі прызнала афіцыйны статус усіх моў, якія з'яўляюцца традыцыйнымі для народаў, што насяляюць краіну. Іспанія, паводле асноўнага закона, была прызнана шматнацыянальнай дзяржавай. У 1979 годзе Каталонія атрымала статус аўтаноміі ў спрошчаным парадку, паколькі ўжо валодала ім у гады Другой рэспублікі, быў адноўлены жэнералітат. Аднак каталонцы так і не атрымалі колішняга самакіравання.

У 2006 годзе ўлады Іспаніі і Каталоніі падпісалі дагавор, які надаваў рэгіёну значную адміністрацыйную і фінансавую незалежнасць, аднак у 2010-м Канстытуцыйны суд Іспаніі адмяніў некаторыя палажэнні гэтага дакумента. Гэта прывяло да шматлікіх акцый пратэсту, а таксама да ідэі рэферэндуму. Неафіцыйныя «трэніровачныя» плебісцыты аб незалежнасці ўжо праводзіліся ў 2009 і 2011 гадах. У 2014-м такая спроба была заблакаваная Канстытуцыйным судом Іспаніі, таму замест яго ў Каталоніі правялі «грамадзянскае апытанне»: амаль 81% тых, хто прагаласаваў, выступілі за аддзяленне ад Іспаніі.

Галоўны камень спатыкнення — не самабытнасць, а эканоміка. Каталонія заўсёды была ключавым рэгіёнам у эканамічным плане краіны. Яна вырабляе 20% іспанскага ВУП і з'яўляецца адным з галоўных донараў для больш бедных рэгіёнаў поўдня Іспаніі. Эканоміка Каталоніі даволі разнастайная: і магутная прамысловасць, і фінансавы сектар, і сучасная сельская гаспадарка. Немалыя багацці прыносіць рэгіёну турызм. Сталіца Каталоніі Барселона з'яўляецца трэцім у Еўропе горадам па наведванні турыстамі і найбуйнейшым портам на Міжземным моры.

Дату чарговага рэферэндуму вызначыў жэнералітат Каталоніі. Нягледзячы на тое, што іспанскі Канстытуцыйны суд прызнаў плебісцыт незаконным, спаслаўшыся на канстытуцыю, якая не прадугледжвае самавызначэння рэгіёнаў. Рэферэндум аб аддзяленні ад Іспаніі — «апошняе, чаго хацела б цяпер каталонскае грамадства», — заявіў прэм'ер-міністр Іспаніі Марыяна Рахой Брэй. І як быццам адказваючы яму, старшыня ўрада аўтаномнай вобласці Карлес Пучдэмон-і-Казамажа абвясціў адзінае пытанне плебісцыту, прапанаванае жыхарам правінцыі: «Ці хочаце вы, каб Каталонія стала незалежнай дзяржавай з рэспубліканскай формай праўлення?»

Мадрыд пачаў ціснуць на Каталонію эканамічна — паспрабаваў стрымаць падрыхтоўку да галасавання аб незалежнасці, запатрабаваўшы штотыднёвых справаздач аб усіх фінансах, каб пераканацца, што рэгіянальныя бюджэтныя сродкі не трацяцца на рэферэндум. 14 верасня Каталонія адмовілася даваць справаздачу аб тратах і паспрабавала аспрэчыць знешні кантроль над сваімі фінансамі. 20 верасня грамадзянская гвардыя Іспаніі пачала ператрусы і затрыманні. Пад варту ўзялі не менш за 14 супрацоўнікаў міністэрстваў эканомікі, замежных спраў, працы і сацыяльнай абароны, а таксама апарату ўрада Каталоніі. Падчас ператрусаў таксама выявілі каля 10 мільёнаў бюлетэняў, падрыхтаваных для рэферэндуму. Акрамя таго, пад следства трапіла больш за 700 каталонскіх чыноўнікаў, якія падтрымалі плебісцыт.

У сваю чаргу, Карлес Пучдэмон абвінаваціў цэнтральны ўрад у адмене самакіравання ў рэгіёне і абвясціў аб увядзенні надзвычайнага становішча. Мэр Барселоны Ада Кола заклікала каталонцаў выходзіць на вуліцы і змагацца за свае правы. У некалькіх дзясятках гарадоў Каталоніі прайшлі масавыя акцыі пратэсту — толькі ў Барселоне, па звестках Bloomberg, на вуліцы выйшла каля 40 тыс. чалавек. Яны выказвалі сваё абурэнне, выкрыкваючы «No pasaran!» («Яны не пройдуць!») — вядомы лозунг рэспубліканцаў канца 1930-х гадоў, калі ў Іспаніі бушавала грамадзянская вайна. Сама алюзія на тыя часы, дарэчы, даволі сур'ёзны знак. Таксама супраць наступу на свабоду самавызначэння афіцыйна выступіў легендарны футбольны клуб «Барселона».

Карлес Пучдэмон не раз заяўляў, што рэферэндум пройдзе ў любым выпадку, дазволіць яго Мадрыд ці не. Прычым даваў зразумець, што яму рэальна пагражае турма, але дзеля незалежнай Каталоніі ён гатовы і на гэта. Мадрыдская El Pais напісала, што дзеянні прыхільнікаў незалежнасці па іспанскім Крымінальным кодэксе могуць быць кваліфікаваныя як «паўстанне» і «змова». Пакаранне — 30 гадоў турмы. Усё вельмі сур'ёзна, але каталонцы здавацца не збіраюцца. «Каталонскія палітыкі, — канстатуе французская La Figaro, — не баяцца апынуцца па-за мяжой закона».

У лабавую?

Марыяна Рахой і Карлес Пучдэмон усё больш нагадваюць ваенных лётчыкаў, якія ідуць адзін на аднаго ў лабавую атаку, заўважае kommersant.ru. А ў ёй, як вядома, перамога за тым, у каго мацнейшыя нервы і больш рашучасці ісці да канца. Яно і зразумела: ужо вельмі высокія стаўкі. Як не раз казаў Марыяна Рахой, рэферэндум у Каталоніі можа прывесці да развалу Іспаніі як адзінай дзяржавы, паколькі з яе могуць узяць прыклад Краіна Баскаў, Арагон, Галісія, Канарскія астравы. І што тады застанецца ад каралеўства? У сваю чаргу, кіраўнік жэнералітата Карлес Пучдэмон называе цяперашні рэферэндум апошнім шанцам Каталоніі заваяваць незалежнасць. Паводле яго слоў, іншага шанцу ў агляднай будучыні не прадставіцца. І гэта таксама факт. Пасля пазбаўленага юрыдычнай сілы апытання аб выхадзе з Іспаніі, якое ў 2014-м папярэдні ўрад Каталоніі правёў замест абяцанага рэферэндуму, правал яшчэ адной спробы плебісцыту будзе азначаць паразу сепаратыстаў. А гэта здыме пытанне аб незалежнасці — як мінімум да прыходу да ўлады наступнага пакалення каталонскіх палітыкаў. Увогуле, адварочваць ад сутыкнення ў такой сітуацыі, піша kommersant.ru, — усё роўна, што накіраваць свой самалёт у зямлю. Чым завершыцца цяперашняе супрацьстаянне даведаемся ўжо зусім хутка: адлік пайшоў на гадзіны.

Захар БУРАК. *burak@zviazda.by*

Извещение о проведении 17 октября 2017 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ №7»

Предмет торгов
Здание конторы с инвентарным номером 712/С-234 общей площадью 48 кв. м, назначение – здание специализированное по ремонту и содержанию автомобильных дорог; гараж с инвентарным номером 712/С-235 общей площадью 177 кв. м (в том числе забор деревянный, решетчатый на бетонных, деревянных столбах, протяженность 40,3 м), назначение – здание специализированное по ремонту и содержанию автомобильных дорог
Площадь земельного участка – 0,1441 га, кадастровый номер – 722580408101000002
Местонахождение – Могилевская обл., Кировский р-н, Боровицкий с/с, п. Скачек, ул. Шоссейная, 1
Начальная цена – 3 867,60 бел. руб. с учетом НДС
Сумма задатка – 386,00 бел. руб.

Продавец имущества – ОАО «ДСТ №7», 223021, Минская обл., Минский р-н, 500 м восточнее д. Богатырево, АБК, тел. (8017) 507-61-83.
Организатор торгов – государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к.10, 220030, г. Минск, тел. (017) 327-05-62.
Условие торгов – победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 3 процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.
Торги проводятся в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества ОАО «ДСТ №7», утвержденным организатором торгов.
К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:
заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.
Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» №BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции №700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.
Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.
В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.
Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.
Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.
Торги проводятся 17 октября 2017 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 05.10.2017 по 13.10.2017 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.
Телефоны для справок:
(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(017) 507-64-43 (ОАО «ДСТ №7»)

Утерянный представительством Белгосстраха по Октябрьскому району г. Минска бланк страхового полиса по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории Республики Беларусь серии ВВ №1274085 считать недействительным.
УНП 100122726

УП «Забудова-Автотранс» (организатор аукциона) извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества

№ Лота	Наименование Лота	Начальная цена с НДС, бел. рублей	Задаток с НДС, бел. рублей	Шаг аукциона, %
1	Автомобиль Peugeot Boxer 2008 г. в.	18000	180	5

УСЛОВИЯ

Победитель аукциона либо в случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Лот по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов), – Претендент на покупку должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Лота в течение 10 (десяти) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
Валюта торгов – белорусский рубль. Валюта платежа – белорусский рубль. Сумма для оплаты задатка за участие в аукционе производится в белорусских рублях.
Условия оплаты приобретенного на аукционе Лота согласовываются Победителем аукциона (Претендентом на покупку) и Продавцом при заключении договора купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения аукциона.
Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона

Аукцион состоится 06.11.2017 в 13.00 по адресу:
Минская обл., Молодечненский р-н, п. Чисть, ул. Заводская, 4

Заявки на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 16.10.2017 по 03.11.2017.
Документы, необходимые для участия в торгах, – заявление на участие в аукционе; платежный документ с отметкой банка о внесении задатка; копии документов, подтверждающих юридические полномочия участника торгов (его представителя). Необходимые документы должны быть представлены по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, п. Чисть, ул. Заводская, 4 не позднее 16.00 3 ноября 2017 г.
Для участия в торгах лицо, заявившее о своем участии в торгах, вносит задаток в счет обеспечения оплаты приобретаемого на торгах имущества в размере 1 процента от начальной цены имущества, выставляемого на торги.
Задаток перечисляется на следующие реквизиты: р/с BY35BELB30121642250820226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», код 226. Получатель – УП «Забудова-Автотранс», УНП 600468334.
Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие в них.
Победителем признается участник, предложивший наибольшую цену.
Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов согласно действующему законодательству.
Более подробную информацию можно получить у Организатора аукциона. По вопросу ознакомления с Лотами связываться по телефону 8 029 160 11 86 в рабочие дни с 8.00 до 17.00

Организатор: 8 (0176) 724 711

Извещение о повторном аукционе 17 октября 2017 г. по продаже объектов недвижимости в г. Пинске

Наименование объекта	Изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-54077 «Цех строительных металлоконструкций»	Изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-54078 «Цех изготовления металлоконструкций»	Изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-54080 «Заготовительный цех»	Изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-54079 «Деревообрабатывающий цех»	Изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-50656 «Административное помещение с коммуникациями»
Номер лота	1	2	3	4	5
Местонахождение объекта	г. Пинск, ул. Калиновского, 11И-1	г. Пинск, ул. Калиновского, 11И-2	г. Пинск, ул. Калиновского, 11Г-2	г. Пинск, ул. Калиновского, 11Г-1	г. Пинск, ул. Калиновского, 11-1
Тип помещения	Совмещенное с другим изолированным помещением	Совмещенное с другим изолированным помещением	Совмещенное с другим изолированным помещением	Совмещенное с другим изолированным помещением	Совмещенное с другим изолированным помещением
Общая площадь (кв. м)	3982,2	4516,7	3351,5	12954,0	3482,1
Площадь земельного участка для обслуживания строения (га)	1,444		3,574		
Начальная цена продажи	206 828,90	234 471,39	230 554,37	291 992, 17	133 092,91
Сумма задатка	20 682,90	23 447,15	23 055,45	29 199, 21	13 309, 29
Условия продажи	Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством	Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством	Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством	Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством	Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством
Характеристика объекта, площадь земельного участка (кв. м), решение об отводе земельного участка	Одноэтажное, состоит из 3-х пролетов по 2160 м² каждый. В состав входит: покрасочное отделение с локальными очистными сооружениями, водопроводная сеть – 127,4 м, канализация фекальная – 91,5 м, ливневая канализация – 143,4 м, линия электропередачи – 593 м, беседка, бетонное покрытие – 2290,2 м². Ввод в эксплуатацию – 1973 г.	Одноэтажное, состоит из 3-х пролетов по 2160 м² каждый. В состав входит: водопроводная сеть – 157,2 м, канализационная сеть – 163,3 м, линия электропередачи – 593 м, беседка, бетонное покрытие – 1922,8 м². Ввод в эксплуатацию – 1973 г.	Одноэтажное, в состав входит: склад пиломатериалов 1389 м², навес 284 м², водопроводная сеть протяженностью 248,9 м, асфальто-бетонное покрытие 1876 м², бетонное покрытие 2751 м², линия электропередачи (ААБЛ-10 3*95) – 200 м, ливневая канализация – 30,8 м, ремонтная мастерская, административные и санитарные помещения. Ввод в эксплуатацию – 1972 г.	Одно и двухэтажное, в состав входит: склад пиломатериалов с бетонным покрытием 3051,3 м² , сушильные камеры 6 шт, навес 72 м², циклоны 3 шт, помещение для газовой сварки со складом, санитарно-бытовые и административные помещения, асфальтобетонное и бетонное покрытие 4979 м², электрический кабель 96,7м, ливневая и фекальная канализация 203,8 м. Ввод в эксплуатацию – 1972 г.	Здание трехэтажное с внутренними собственными коммуникациями (водопроводная, канализационная сеть, линия электропередачи). Имеется отопление (собственная котельная) Ввод в эксплуатацию – 1971 г.

Наименование объекта	Капитальное строение с инвентарным номером 130/С-44659 (здание компрессорной с прилегающими сооружениями и инженерными сетями)	Капитальное строение с инвентарным номером 130/С-44622 «Здание компрессорной с ремонтно-механическим участком, цех доборных изделий»	Изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-58323 «Помещение арматурного цеха»	Изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-58322 «Помещение формовочного цеха с эстакадой для принятия бетона»	Комплекс зданий и сооружений (помещение формовочного цеха, арматурного цеха с бетоносмесительным центом с инвентарным номером 130D-58321; склад готовой продукции с инвентарным номером 130/С-44660; очистные сооружения с инвентарным номером 130С-44951; комплект гаражей с инвентарным номером 130/С-44658; железнодорожный путь с инвентарным номером 130/С-44660)
Номер лота	6	7	8	9	10
Местонахождение объекта	г. Пинск, ул. Калиновского, 11П	г. Пинск, ул. Калиновского, 11У	г. Пинск, ул. Калиновского, 11/1-3	г. Пинск, ул. Калиновского, 11/1--2	г. Пинск, ул. Калиновского, 11/1
Тип помещения	Отдельно стоящее	Отдельно стоящее	Совмещенное с другим изолированным помещением	Совмещенное с другим изолированным помещением	Совмещенное с другим изолированным помещением
Общая площадь (кв. м)	539,0	1930,1	3200,6	1944,40	
Площадь земельного участка для обслуживания строения (га)	0,1827	0,3941			
Начальная цена продажи, рублей	67 418,89	1 706 493, 50	537 753,90	351 792,81	5 879 310, 44
Сумма задатка, рублей	6 741,89	170 649,35	53 775,39	35 179, 28	587 931, 04
Затраты на оценку, организацию и проведение аукциона, рублей		1498,71			
Условия продажи	Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством	Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством	Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством	Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством	Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством
